Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 11 (28610) Год LVI | Беласток, 13 сакавіка 2011 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 5%)

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ = ГОНАР

Хуткімі крокамі набліжаецца Нацыянальны перапіс (1 красавіка — 30 чэрвеня). Прыгадаем, што трэба будзе вызначыць сваю нацыянальную прыналежнасць. Ёсць шанц, каб мы ўрэшце палічыліся згодна з фактычным станам, асабліва таму, што маем магчымасць падаць свае даныя шляхам інтэрнэту (да 16 чэрвеня). Усё паказвае на тое, што нас на Падляшшы больш, чым тыя 48 тысяч 737 асоб, як аказалася ў час перапісу 2002 года.

Аб патрэбе нацыянальнага, беларускага самавызначэння ў час перапісу ў гэты раз размаўлялі мы з прадстаўнікамі беларускага творчага асяроддзя. Адзін з найвыдатных беларускіх пісьменнікаў

САКРАТ ЯНОВІЧ

з Крынак сказаў:

— Трэба ўздзейнічаць на чалавечы гонар. Калі адрачэшся ад сваёй беларускасці, гэта не значыць, што будзеш мець больш грошай. Іх прыліў не залежыць ад нацыянальнасці, а ад фаховых умеласцей кожнага. Калі ты фаховец, спецыяліст, такое будзе запатрабаванне на цябе як на чалавека, асабліва цяпер ва ўсёй Еўропе.

Заклікаў:

— Нацыянальнасць — гэта пачуццё ўласнага гонару. Беларусы, не рабіце з сябе вар'ятаў! Ніхто ад вас не патрабуе, каб вы прытвараліся кімсьці іншым, чым ёсць. Тыя, што не хочуць прызнацца да беларушчыны, баяцца палякаў, бо палякі — неталерантныя. Ды асабліва маладыя палякі адчуюць абразу, што хтосьці іх баіцца, бо палякі паважаюць гонар чалавека. Не любяць трусоў. І ўвогуле Гасподзь Бог не любіць трусоў! Трэба тут звяртацца да маладых беларусаў, такіх да сарака гадоў. Няма ў іх таго страху. Маё пакаленне надалей перапалоханае. Асноўны аргумент за тым, каб у спісе вызначыць сваю беларускую прыналежнасць, такі: каб быць сабою.

І адзначыў:

— Я быў беларусам заўсёды і мяне за гэта заўсёды паважалі.

Сусветнай славутасці мастак з Валіл, які на кожным кроку адзначае сваю беларускасць,

ЛЯВОН ТАРАСЭВІЧ,

перакананы ў тым:

— У сітуацыі ў Польшчы, якая спрычыняецца да таго, што беларускасць не прыносіць ніякіх карысцей у рацыянальны спосаб і што прытым у большасці маем дачыненне з сялянска-рабочым грамадствам, дык тут аргументы звязаныя з нацыянальнай свядомасцю (дарэчы, у ніякім народзе) не выконваюць першапланавай ролі. Кожны выбірае такую пазіцыю, каб жыць лепш і выгадней. Так было таксама і з палякамі на Шлёнску, у Нямеччыне ці на тэрыторыі былога СССР з Картай паляка. Кожны шукае якіхсьці выгад ад таго, што ён з'яўляецца палякам. Адзіны спосаб, каб прызнацца да беларускасці, гэта адукацыя самасвядомасці. Пытанне пра нацыянальнае саамадчуванне гэта пытанне кранаючае маральнасць.

Адносячыся да магчымай акцыі датычнай нацыянальнага самавызначэння ў перапісе, Лявон Тарасэвіч сказаў:

ІГНАТ КАРПОВІЧ

— Такая акцыя павінна мець сувязь са штодзённым быццём, з тым, што ёсць месца для іншых у гэтай краіне, а не з нейкай аднаразавай маніфестацыяй. На даўжэйшы час гэта не аплачваецца. Аплачваецца тое, што робяць Сакрат Яновіч, Ігнат Карповіч [гэты пісьменнік, падарожнік, перакладчык, лаўрэат „Пашпарту «Палітыкі»" і літаратурнай прэміі імя Казанэцкага, родам са Случанкі, сказаў на Радыё Рацыя: „Рашуча я — беларус" — М.Х.] ці я.

Прызнаная таксама па-за межамі Польшчы мастачка, родам з Бельска-Падляшскага

МАРГАРЫТА ДМІТРУК,

падобна як Лявон Тарасэвіч, ганарыцца сваёй беларускасцю:

— Трэба проста быць сабою. Гэта найважнейшае, каб быць аўтэнтычным. Мне гэтае пытанне здаецца быць дзіўным. Ці трэба кагосьці пераконваць, каб быць сабою? Ці трэба гэтаму неяк вучыцца? Трэба быць свядомым самога сябе. Кожны мусіць дасягнуць да сваёй тоеснасці, між іншым і нацыянальнай. Чым раней, тым лепш. Я мела тое шчасце, што нарадзілася ў сям'і, якая маю беларушчыну ідэнтыфікавала вельмі рана.

На пытанне ці патрэбная нейкая адмысловая акцыя звязаная з неабходнасцю, патрэбай беларускага самавызначэння ў час перапісу, Маргарыта Дмітрук заявіла:

— Я жахнулася гэтым пытаннем, гэтай задумай, што мусяць арганізавацца неякія спецыяльныя акцыі, каб мы прызналіся да беларускасці, што трэба ў гэтым плане людзей усведамляць. Кожны сам павінен вырашыць аб самавызначэнні індывідуальна. Разумею, што былі розныя польска-беларускія непаладкі ў мінулым, што пераходзілі з пакалення на пакаленне і, мабыць, у нашай краіне лягчэй быць палякам чым кімсьці іншым. І можа гэта спрычыняецца да нейкай боязі перад прызнаннем да беларускасці. Аднак, адзначу яшчэ раз, трэба тут быць шчырым у адносінах да сябе самога, але і да іншых.

Вядомы дакументаліст

ПЁТР НЕСТАРОВІЧ,

якога карані ў Орлі, не скрываў, абагульняючы праблему:

— Цяпер такі час, што глабалізацыя, інтэрнэт знішчаюць пачуццё нацыянальнай прыналежнасці, прытым ва ўсім Еўрасаюзе. Найважнейшае, аднак, тое, каб не саромецца сваёй нацыянальнасці, свайго нацыянальнага паходжання. Са шкадобай гляджу на тое, што адбываецца ў Орлі. Да дзяцей гавораць па-польску, і да сабак гавораць па-польску, а паміж сабою ў прынцыпе — па-свойму. А справа ў тым, каб новае пакаленне трактавала беларускую мову як сваю.

Дадаў:

— Не сорам быць у Польшчы беларусам, таксама як кожным „іншым". Быўшы беларусам у Польшчы становішся больш універсальным, разумнейшым, чым быўшы выключна палякам, функцыянуючы паводле нейкіх прынятых канонаў. Быццё іншай нацыянальнасці ці рэлігійнасці адкрывае мозг, светапогляд, робіць нас багацейшымі. Дае іншыя арыенціры. Тады мы — нешаблонныя. Калісь праводзіліся доследы на дзесяцёх дзецях. Далі дзевяці з іх надта салодкі суп, аднаму — надта салёны. Дзевяцёра прызналася, што ядуць надта салодкі суп, а дзесяты таксама сказаў, што і яго суп надта салодкі. Метафарычна скажам, гаворка пра тое, каб не баяцца прызнацца да таго, што дастаўся нам надта салёны суп, калі ў іншых ён — перасалоджаны!

Чацвёртая ўлада

Тыдзень таму давялося пазнаёміцца з вядомым нарвежскім журналістам Эрлінгам Боргенам. Ад бальшыні сучасных заходніх калег яго адрозніваецца адзін істотны момант. Чалавек доўгія гады працаваў рэпарцёрам у розных кутках свету і ў прынцыпе ўжо мог бы карыстацца былым аўтарытэтам і спачываць на лаўрах. Але яго, як няўрымслівую натуру, пацягнула ў іншы жанр — апошнія гады Борген стварае вострыя і злабадзённыя дакументальныя фільмы. Практычна заўсёды яны звязаны з Нарвегіяй, але не толькі з тэрыторыяй, якая размешчана на Скандынаўскім паўвостраве. Эрлінг ездзіць у іншыя краіны і вядзе сапраўдныя журналісцкія расследаванні. Пры тым ставіць такія пытанні, пра якія бальшыня ў грамадстве нават не задумваецца. Не задумваецца таму, што не хоча разважаць. Гэта толькі адзін з беларускіх „канструктыўна-апазіцыйных" палітыкаў вылучыў абсурдны тэзіс „думаць — гэта не балюча". Насамрэч, думаць — гэта вельмі цяжка, балюча і часам хваравіта.

Адзін з фільмаў Боргена быў прысвечаны выкарыстанню ў Індыі наёмнай працы падлеткаў на гранітных каменяломнях. Пры чым тут нарвежскае грамадства? А пры тым, што нарвежская фірма экспартуе выраблену гранітную плітку ў сваю сталіцу і іншыя гарады. І па ёй, аплачанай здароўем і часта жыццём індыйскіх дзяцей, якія за вельмі шкодную працу атрымліваюць па адным долары ўдзень, пасля ўрачыста крочаць члены каралеўскай сям'і, лаўрэаты Нобелеўскай прэміі... Фільм, які скалыхнуў нарвежскае грамадства, прывёў да таго, што згаданая фірма была змушана завезці ў бедную азіяцкую краіну патрэбнае тэхнічнае абсталяванне і значна палепшыць умовы працы. Праўдзівая журналістыка тут выступіла як сродак справядлівасці.

Эрлінг Борген гаворыць пра тое, што нарвежскія і еўрапейскія ўлады, міждзяржаўныя структуры, шмат і слушна гавораць пра трагічную грамадска-палітычную сітуацыю ў Беларусі, але практычна заўсёды маўчаць пра Азербайджан. Чаму? Адказ на гэтае пытанне вельмі просты. Буйная нарвежская карпарацыя Statoil, якая інвеставала ў азербайджанскую эканоміку вялікія грошы, мае ад аліеўскага рэжыму значныя прыбыткі. Дзе ўжо ім тут казаць пра дыктатуру і ўзурпацыю ўлады ў гэтай крымінальнай дзяржаве. Пра забойствы, арышты і зняволенні журналістаў, пра фальсіфікацыі на прэзідэнцкіх выбарах, якіх насамрэч няма. Пра ўсё гэта расказвае Борген, якога многія называюць „камуністам", „вар'ятам", у сваім іншым дакументальным фільме, які не толькі дае праўдзівую інфармацыю, але і ставіць важнейшае пытанне нашага часу: „Ці можа быць мараль у палітыцы і эканоміцы?". Гэта і ёсць сапраўдная праява „чацвёртай улады", дзейсны ўплыў журналістыкі, якая мусіць быць у апазіцыі да кожнай улады, на грамадскія працэсы і свядомасць грамадзян.

Прывяду і адваротны ўзор журналістыкі-прапаганды. Днямі ўвесь свет абышлі кадры, як лівійскія фанатыкі істэрычна цалуюць партрэты Муамара Кадафі і святкуюць поўную перамогу над суграмадзянамі-паўстанцамі. Пра бліскучую ваенную „вікторыю" над „мяцежнікамі" ім расказала дзяржаўнае тэлебачанне. Але ж насамрэч канца грамадзянскай вайне ў Лівіі, якую развязаў „вялікі бедуін і правадыр" не відаць і краю...

А вось яшчэ іншы прыклад журналістыкі. Аўтарытэтная „The Wahsington Post" тыдзень таму ўзяла інтэрв'ю ў кіраўніка Рэспублікі Беларусь. Навошта спатрэбілася выданню гэтая гутарка — сказаць цяжка (можа, каб наклад і продаж нумару ўзняць?). І пытанні старшай рэдактаркі газеты, здаецца, былі вострыя, але ўсе ж адказы былі вядомыя наперад. Правіцель РБ яшчэ раз усіх павучыў як трэба жыць і расказаў амерыканцам, што ён думае пра палітыку Злучаных Штатаў. А на пытанне пра палітычныя рэпрэсіі і расправы над іншадумцамі ў Беларусі, не мігнуўшы вокам, адказаў, амаль як у антычныя часы, маўляў суровы закон, але ён жа закон і мы толькі падпарадкоўваемся яго вяршэнству. Можа „The Wahsington Post" і кіравалася самымі шчырымі намерамі, але якой мэты дасягнула гэтае інтэрв'ю? Больш людзей даведалася праўды пра Беларусь? Вельмі і вельмі сумніўна. Слова — не менш моцны сродак, чым магутная зброя. Часам яно кардынальна мяняе сітуацыю да лепшага, а часам хавае ці скрыўляе праўду. Залежыць, хто і як ім карыстаецца...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Вітаем у Сеціве

Не ведаю, ці прэзідэнт Лукашэнка меламан, ды прапаную яго ўвазе Канцэрт для фартэпіяна № 23 Моцарта — твор падымаючы кожнай сваёй фразай інтуіцыю, што смерць настолькі прыгожая, наколькі папярэджвала яе прыгожае жыццё. У адваротным выпадку з'яўляецца толькі знішчальным фактам, які найлепш тлумачаць словы Тарквата Тасо: „Калі б смерці не існавала, не было б нічога больш марнага за чалавека".

Папраўдзе Фрыдрых Ніцшэ ставіў не пазбаўлены рацыі тэзіс, што вырваныя з кантэксту факты — дурныя, слушным з'яўляецца таксама тое, што гаварыў булгакаўскі Шатан з „Майстра і Маргарыты" — яны таксама ўпартыя. Дарэчы, сказ Шатана „факты гэта справа ўпартая" паўтараў з асалодай Сталін і няважна, ці зрэзаў гэтую рэфлексію ад Булгакава, якога ўважліва чытаў, ці абапёр яе на ўласным досведзе. У кожным разе магчыма, што на схіле жыцця ўсвядоміў, што злачыннае мінулае не з'яўляецца чымсьці калекім і цьмяным, а канкрэтным і з-за гэтай канкрэтнасці няўхільным, што якраз з'яўляецца сутнасцю факта. Ці то ад гэтага часу не стаў ён кепска высыпацца, паводле ўласных слоў, „скручаны як сабака", шукаючы патолі ў безупынна ўключаным Канцэрце для фратэпіяна № 23?

Няўхільнай з'яўляецца гекатомба смерці і пакуты дзесяткаў мільёнаў людзей складзеныя на ахвяру сталінскаму молаху. Няўхільнай з'яўляецца таксама смерць кожнага з нас. У святле гэтага факта паказваецца, што кожны найвялікшы нават тыран, як кожны на схіле свайго жыцця, становіцца чалавекам перад смерцю бездапаможным. Няйначай Сталін. Прагрэсіруючы атэрасклероз і мозг пасля шматлікіх мікраінсультаў сціснулі яго розум да ўзроўню маразматычнага гнома з вялікім каўдуном і наступаючай амнезіяй. Воблік старэчы, пагружанага ў абсалютным бяспамятстве, мог бы яшчэ выклікаць спачуванне, ды... факты гэта рэч упартая! Рысы, якія вынеслі Сталіна на вяршыню ўлады, падазронасць, жорсткасць, схільнасць да маніпуляцыі, замест ступець на старасць, паваструэлі, і з-за гэтага стаў ён яшчэ больш крыважэрным. Ці, значыць, што Тасо не меў рацыі?

Дзмітрый Валкагонаў, армейскі палітрук з часу брэжнеўскага „застою", а прытым дамарослы гісторык, у таўшчэзным томе п.з. „Сталін" спакусіўся прааналізаваць феномен дыктатара. Стараўся ён утрымаць у грамадстве, — піша той гісторык, — атмасферу падазронасці, страху, паколькі ведаў, што там, дзе пагражае безупынная небяспека з боку больш ці менш уяўных, унутраных ці вонкавых, ворагаў, патрэбны цвёрдарукі правадыр. „Бо калі ў грамадстве няма ворагаў, — рытарычна пытаецца Валкагонаў, — людзей з іншымі поглядамі, няма змагання, — дык нашто яму дыктатар?"

Сталін дасканала прысвоіў сабе тэхніку, ляжаўшую ў аснове ўсіх маніпуляцый, якая заключаецца ў тым, каб у грамадстве ўтрымліваць безупынна высокую напругу барацьбы, шляхам перанясення яе на плоскасць ідэйнага кляймавання або палітычнай элімінацыі тых, хто мог бы прэтэндаваць на ўладу, якую ўзурпаваў выключна для сябе самога. Спачатку, — піша Валкагонаў, — Сталін абапёрся на канцэпцыю класавай барацьбы. Аднак, знішчыўшы класавых ворагаў, абшарнікаў, капіталістаў, і на канец кулакоў, мусіў крэаваць новую формулу ворага, выражаную ў сцвярджэнні, што „ворагі будуць заўсёды". Пасля элімінаваў сваіх палітычных праціўнікаў. „Ворагаў будзем у будучыні разбіваць таксама, як разбіваем у цяперашні час і разбівалі ў мінулым", — напісаў у адной са сваіх апошніх прамоў чырвоны тыран. Не вызначыў, аднак, кім мелі б быць тыя ворагі. Бо ж і не пра дэфініцыю ён думаў, а пра тое, што без ворагаў ягоная ўлада не мела ніякага сэнсу.

А цяпер Аляксандр Лукашэнка... Спацыфікаваў ён кулаком і дубінай унутраных ворагаў, а на вонкавых махнуў рукою, бо што ж гэта за ворагі... І што, без ворагаў яму застацца? Дзе ж там! Прыняўшы пад увагу тое, што ў апошні час дзякуючы інтэрнэт-камунікатарам звергнулі пару дыктатараў, можна меркаваць, што ўжо неўзабаве і Лукашэнка аб'явіць імя новага ўрэднага ворага — інтэрнэт. А гэта і добра. Ужо там шыкуюць яму... прывітанне ў Сеціве.

Міраслаў ГРЫКА

Вачыма еўрапейца

Непрыемнае ўражанне

Засталося ўва мне непрыемнае ўражанне ад таго, што адбываецца вакол афёры з удзелам падляшскага маршалка Яраслава Дважанскага і яго супрацоўнікаў. Як ведаеце, ольштынская пракуратура абвінаваціла ў каральных дзеяннях мінш. маршалка, Яцка Пярунка — члена ўправы і Збігнева Нікітаровіча — дырэктара кабінета маршалка. Усе падазраваюцца ў злачынстве звязаным з наборам працаўнікоў у Маршалкоўскую ўправу і карупцыю пры персанальных вырашэннях ды размеркаванні еўрасаюзных сродкаў. Некалькі дзён да склікання нечарговага пасяджэння сеймікa (па прапанове апазіцыйнага ПіС), але пасля вынясення абвінавачання пракуратурай маршалак Дважанскі, Яцак Пярунак і дырэктар Нікітаровіч прыпынілі сваю дзейнасць у Грамадзянскай платформе.

У час нечарговай сесіі сеймікa Дарыюш Пянткоўскі, старшыня ПіС на Падляшшы і кіраўнік апазіцыянага клуба ПіС у сеймікy гаварыў пасля абарончай прамовы Яраслава Дважанскага:

— Пан маршалак прымяніў сцвярджэнне, што найдаражэйшыя яму самаўрад, дабро ваяводства і яго жыхароў. З яго выказвання мяркую, што таксама дабро ГП і яе членаў. Таму пан маршалак прыпыніў сваё членства ў сваёй партыі. Падобна зрабілі яго калегі. Мела гэта быць дзеля добрага імя ГП.

Далейшыя дзеянні ПіС паставіў у залежнасць ад адказу маршалка на пытанне:

— Ці для дабра ваяводства, так як для дабра ГП, вы гатовы падаць у адстаўку?

Маршалак Дважанскі:

— Дабро ваяводства і дабро самаўрада патрабуе, каб мы працягвалі сваю місію.

Так вось старшыня Пянткоўскі падаў прапанову адхіліць маршалка ад пасады:

— У сітуацыі, калі падляшскага маршалка і яго найбліжэйшых супрацоўнікаў ахапіла пракурорскае абвінавачанне, безумоўна, гэта з'яўляецца перашкодай у працы ўлад ваяводства (...). Управа, кіраваная асобамі пад пракурорскімі абвінавачаннямі, будзе дэмаралізваць усіх працаўнікоў управы. Спадары Яраслаў Дважанскі, Яцак Пярунак і Збігнеў Нікітаровіч, дарэчы, прыкмячаюць неадпаведнасць гэтай сітуацыі, паколькі прыпынілі сваю дзейнасць у ГП. Калі гэтая сітуацыя шкодзіць палітычнай партыі, мусіць таксама шкодзіць і нашаму самаўраду.

Зараз пасля таго, як трое абвінавачаных спынілі членства ў сваёй партыі, яе старшыня Дам'ян Рачкоўскі адзначыў у СМІ:

— Гэта ганаровы выхад.

Апазіцыя намякала, пералічваючы прозвішчы асоб абвінавачаных і занятых ва ўстанове:

— Абвінавачанні датычныя свайго роду палітычнай карупцыі, прымання на працу калег з партыі уласнай або кааліцыянта. Можна тут паставіць пытанне пра маральныя прынцыпы, а не толькі пра крымінальны кодэкс.

Маршалак Дважанскі:

— Не было стварання пасад для гэтых людзей, толькі быў набор на свабодныя штаты. Я тут не знаходжу следу палітычнай карупцыі.

Вядома, існуе прынцып прэзумпцыі невінаватасці, пакуль не даказана камусь віна. Аднак у выпадку асоб на кіраўнічых пасадах пракурорскае абвінавачанне павінна — на маю думку — спрычыніцца да іх самаадводу. Таму, што кожнае іхняе рашэнне можа выклікаць асабліва грамадскія маральныя сумненні. Цяжка не пагадзіцца з тым, што для трох чыноўнікаў дабро партыі і яе імідж важнейшыя ад дабра і іміджу ваяводства. І нарэшце — што з падтрымкай партыі Яраславу Дважанскаму як маршалку? Мабыць, акажацца гэта 14 красавіка, калі мае адбыцца галасаванне за яго адхіленне; цікава як павядуць сябе ў гэтым выпадку радныя ад ГП?

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Лірычны ляснік з Лешукоў

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Тадэвуш КУНЦЭВІЧ з унучкай Антанінай

Адзін з самых марозных дзён гэтай зімы. Вылажу з аўтобуса, і аж хочацца ўбачыць, як па вуліцы мчыцца экзатычны эму з *Eliaszuk*, што ўбачыў быў знянацку табліцу „Лешукі". Дзівак эму — ці цяпер у Нараўчанскай гміне схочацца радным яшчэ раз падняць роднае і абмеркаваць яшчэ справу двухмоўных назваў? Пасярод вуліцы брыдзе вялікі светлы сабака. Нічый ён, — скажа чалавек, які выходзіць з дому з нумарам 22, што амаль насупраць прыпынку пэкаэсу. Гэта пра яго гаварыла Галена-Марыёля Рэент, што сваім словам развесяляе ваколіцу. З вясёлым тварам вядзе мяне ў хату.

— Хата яшчэ дзядоўская. А я — прымак. Прачытаць пра прымака? — пытаецца Тадэвуш. Жонка Тадэвуша, Марыя, з усмешкай ставіць пірожнае на стол і смяецца:

— Мне найбольш падабаюцца „Суседкі". Такое з жыцця ўзятае. Такая сатыра на кабет. Трэба мець пачуццё гумару.

— То слухайце. „Чэсць, суседка! Як па свяце?.. — чытае са свайго сшытачка сатыру дзядзька Тадэвуш і крыху сароміцца: — Вучыцца беларускай мове кончыў у 1965 годзе. А праз столькі гадоў пачаў па-беларуску пісаць. Ну, забыўся тэорыі граматыкі, пішу як чую. Пішу як гавару. Стараюся запісаць па-беларуску. Мог бы я той верш, скажам, камусь падыктаваць, каб хтосьці, хто ведае мову, запісаў без „быкоў". Самі пабачыце, ці варта мне пісаць. Я і для дзяцей верш напішу, і патрыятычны, і смешны... Запішу на картцы, кіну... Ды мяне Марыёля з самаўрадавай святліцы ў Старым Ляўкове „выцягнула". Была імпрэза ў Ляўкове, саракагоддзе будаўнічай керамікі... То зноў пра войта, пра працаўніц гміны і іншых устаноў...

Нарадзіўся ён тут, вучыўся ў лешуцкай школе. Пасля выбраўся ў лясны тэхнікум. Цікавіўся і музыкай.

— Як пішуць песні? Бадай да мелодыі словы складваюць. Я, будучы вучнем Лясного тэхнікума ў Белавежы, як то моладзь, да сусветных гітоў свае словы складаў, і на гітары „выжываўся"... Пасля тэхнікума здаваў у Вайсковую тэхнічную акадэмію, там дзе быў Аляксандр Вярбіцкі. Хлопцы былі на апошнім курсе (пару хлопцаў было з нашай ваколіцы), ды я... уцёк (смяецца). Якраз было Пятра і Паўла, трапілася першая любоў, а баяўся, каб дзяўчына не ўцякла... Гэта ж была мая Марынка! Тут забава, тут „одпуст", а я там на экзаменах, вайскоўцы ў скуру даюць! Прыпёр дахаты! Марынка якраз кончыла гайнаўскі беларускі ліцэй... Пасля рабіў у Лясах. Жыў у Масеве, рабіў у Пасеках (памятаеце Грабешкава?). Памятаю добра тэрыторыю — Семяноўка, Пасекі, Мадзьвадзі... Гэта быў мой абход. Там быў падляснічым, пасля ў Надлясніцтве Жэдня, дакладна ў Ялоўцы, быў ляснічым. Пасля прыйшоў Шура Харкевіч, што быў дырэктарам у лешуцкай школе, запрапаванаў мне, каб я вучыў. Вучыў я гісторыі, матэматыцы... Калі вучыўся ў тэхнікуме, для мяне матэматыка гэта было захапленне, ездзіў па матэматычных алімпіядах, прымаў удзел у агульнапольскай. Каб на сённяшні час — пайшоў бы вывучаць матэматыку. Як пераможца алімпіяды меў гарантаваны індэкс. На кібернетыку пацягнулі нас старэйшыя калегі...

— Чаму вы, хлопцы адсюль, так гарнуліся да тае кібернетыкі?

— Быў такі год, што Аляксандр Вярбіцкі, Міша Харкевіч (што цяпер у Познані, ужо пенсіянер, падпалкоўнік), Янак Бандарук з Ляўкова. Чацвёрты быў з Альхоўкі, Раманчук. Мяне пацягнула на той ВАТ здаваць, бо як яны прыедуць, памятаем, чатырох ішлі ў мундзірах, страшна нам гэта імпанавала. Такія хлопцы спраўныя...

Абое яны — Тадэвуш і Марыя — 1950 года нараджэння. Жонка працавала ў лешуцкай школе, навучала матэматыцы і біялогіі. Калі жылі ў Масеве, вучыла ў тамашняй школе. Пасля дзяцей тут было штораз менш, спалучалі класы, пасля школу ўвогуле ліквідавалі (у 1997 г.).

— І што ўжо рабіць — ужо стары чалавек, на пенсію! Нас тры пайшлі на пенсію адразу — і Раіса-дырэктарка, і Кася з Лукі, і я. Дзеці ў Нараўку пайшлі. Цяпер з Лешукоў двое ці трое ходзіць, і з Міхнаўкі, і з Церамок недзе па адным.

— Дзяцей у нас сваіх двое, — чуецца гонар у голасе бацькі. — Сын з 1972 года, у Торуні афіцэрам, хату там пабудавалі, а дачка ў Семяноўцы пагранічніцай, юрыстка па адукацыі, робіць дактарат. Абое — у мундзірах. Унучка адна, ад дачкі — у чацвёртым класе, другой — 9 месяцаў...

— То бабуля едзе ў Нараўку папільнаваць, то сюды прывозяць. Сілы малавата ў бабулі, ды ўдвох весялей заняцца — калі дзядуля памагае, дык лягчэй, — бабулі Марыі якраз прывезлі малодшую ўнучку. Малеча працягвае ручкі да дзедка. І ўсе смяюцца.

— Ці цягне Тадзіка ў лес? У лясах ужо не працуе. Але лепш няхай піша, чым па лесе ходзіць! Жартую. Неяк сам пачаў пісаць, нічога нікому не гаварыў. Потым прачытаў сатырычны верш, той пра Сушчу — пасмяяліся, а пасля наступны. З маладых гадоў ён меў такую цягу да пісання, а можа больш да музыкі. Калі б ноты ведаў, мог бы занатоўваць тое, што ў душы яму іграе. Беларускую мову не вывучаў, піша тэкст, мяркуе, як слова падабраць, каб гучала добра, трапна, меладычна. Я вучылася яшчэ беларускай мове ў ліцэі, ды не маю ніякага „палёту" да пісання, да паэзіі, — прызнаецца Марыя.

— А чом ты крычыш на мяне па-беларуску добра? — смяецца Тадэвуш. — І не заікнецца! Так садзіць як сячкарня! Іншая справа, верш не кожны аднолькава слухае. А вось яшчэ адзін верш пра суседзяў. „Адкажы мне, даражэнькі, чом такі ты неўдаленькі...". А вось зноў іншы тып верша, прысвечаны Мірану Хадакоўскаму... А тут: *Сказаў бацька мне сур'ёзна: Глянь мне ў вочы: ці так можна?! Не шкадую табе хлеба, ажаніцца ўжо трэба!* А для дзяцей — кароценькія. Ездзіў я апекуном у транспарце з дзецьмі. Забаўляў іх таксама ў дарозе. І таксама час ад часу пішу вершы „на заказ". Марыёля папрасіла — для працаўніц гміны, школы, канкрэтных жанчын... Думаю ўвекавечыць чатыры поры года ў Лешуках. Чую такую мелодыю. Мне штосьці зрыфмуецца... Вазьму картачку.. Штосьці не так... папраўлю, перакрэслю... І тады прачытаю — мне добра. Перапішу начыста, — а той верш у чыставіку быццам іншым становіцца. Найбольш арыгінальны запіс — той найпершы. Найбольш ён мой! А надрукаваны — яшчэ інакш чытаецца. Тую мелодыю чую. Ці пішу аб лесе, маім улюбёным? Так агульна, не пісаў пра паасобную шышку ці жолуд... Часам сярод ночы прарвецца. Устану, рыфмы б'юцца ў галаве. Запішу. Пасля можа гэта быць падстава для верша. Бывае, што не ад пачатку а... ад канца верш пачынаецца. Вылаўліваецца гармонія. Вядома, бываюць і „аднаразоўкі"-прысвячэнні — людзям, вёскам. „Семяноўка — кожны знае, што вяліку ваду мае... Зеляніцца ўсё наўкола, ззелянела... нават школа! Вось скажу я вам навіну: знаеце вы Эвеліну? Што за лад яна трымае, а якіх кухарак мае! Гавару вам — то не смешкі — калі зварыць штось Агнешка! Еў бы да самога рання, як прыправіць едла Аня. А паеўшы — адпачыці можна ў святліцы: чыста, схлюдна і прыемна, ніхто не скажа, што тут дрэнна. Чуемся як у сваёй хаце. А пра гэта трэба дбаці. Гэта жадна не навіна — светліцовай ёсць Галіна. Побач тораў, ля хваіны — стацыянуе штаб Аліны. Кожная з іх вельмі прыемна — не была б то служба *цэльна*... Сапраўды — усе ўдаліся: Аня, Сільвія і Марыся; спазіраем як ля бюра йдзе Бажэна разам з Уляй. Вершам не апішам гэта, як паявіцца Анэта...".

Талентаў прарывалася ў яго шмат.

— Калісь рабіў з запалак домікі, шкатулкі. Быўшы ў войску ў Хэлме, зрабіў для Цэпэліі, дарам, забудову вітрыны ў Любліне: хату, клуню, хлеў, воз драбінясты... — увесь макет сялянскай гаспадаркі. Ды цягнула да „мундзіра". З войска здаваў на вышэйшую школу пагранічнікаў у Кентшыне. Здаў экзамены, быў прыняты, ды мае дакументы са штаба не выслалі: прыйшлі паперы ў штаб, што маю ехаць у харанжоўку, а мае паперы схаваныя на дно шуфляды. А ў войску я быў у сапёрах. І маю памятку — пры разміноўванні нявыбух адарваў мне кавалак далоні. Больш за трыста адломкаў вымалі, паштукавалі далонь, як таму Кубіцы. І так мая прыгода з мундзірам кончылася. Затое дзеці ў мяне — мундуровыя. Сын Войтак, капітан, у Афганістане ваяваў, шчасліва вярнуўся. Дачка Уля пагранічніца. Так мае „мундзірныя" мары яны зрэалізавалі. А з гітарай мая прыгода была кончана. Ну, адно дзецям якія балады пайграю. Унук з Торуні, Коля, іграе ма-майстэрску на акардэоне, раней яго з-за акордэона не відаць было як са сваімі настаўнікамі канцэрты даваў. Сюды прыедзе, як зайграе — душа вяне. А ўнучка Наталька — дасканалая матэматычка... Маладыя рэалізуюць нашы мары.

І Тадэвуш, лірычны ляснік з Лешукоў, працягвае чытанне сваіх вершаў. Чакайце іх не толькі ў Нараўчанскай гміне!

Тадэвуш КУНЦЭВІЧ

Мая старонка

Найбольш я шчасця ў жыцці меў,
што на Падляшшы нарадзіўся.
Хоць хлеба тоншу скібку еў,
у старонку гэту я ўлюбіўся.
Таксама тут цябе спаткаў,
тут мае дзетк, і мае ўнукі.
З сябе, што меў, усё аддаў,
і не хацеў бы я разлукі.
Люблю наш край, яго прыроду,
не цяжка гэта ўсё замеціць,
Люблю балота, лес і воду,
бо сонца найясней тут свеціць.
Тут птушкі прыгажэй спяваюць
і нівы мёдам пахнуць,
і жыхары, што ўжо чакаюць,
калі іх свечкі згаснуць.
Чыгунка раніцай гудзіць,
і рэчка Нарва што плыве,
і Лядска пушча што шуміць —
вось тут любоў мая жыве.

У Лешуках я нарадзіўся

У Лешуках я нарадзіўся,
вучыўся крокі ставіць,
найгоршай думкі я пазбыўся,
каб мог я іх аставіць.
Тут у пачаткову школу йшоў,
мама вяла за руку,
тут шчасце я сваё знайшоў,
тут зачынаў навуку.
Было, што ў хаце падаў дождж,
бура была вяліка,
нямала вылілася слёз,
і брыдкіх слоў без ліку.
За вёскай — памятнік стары,
што крыж ужо хіліўся,
як дзеда ў труне няслі,
каторы не нажыўся.
І бабу помню, як умярла,
паставілі ля крыжа, —
у той дзень спявалі жураўлі,
бо ключ ляцеў у вырай.
Як прыйдзе дзень, у якім умру,
лёс будзе ўжо раздзерты,
няхай Шчапанік заспявае
мне пра „Пустыя канверты".

Лапці з ліпавага лыка

Калісь мужчыны з маёй вёскі Ахрымы — і суседніх — у вяснова-летнім сезоне абуваліся ў лапці выраблены з ліпавага лыка. У тую пару з ліпавых сукоў здзіралі кару ў выглядзе паскаў і з тых паскаў выпляталі лапці, так як выплятаюць лубянкі для садавіны. Лапці мелі наскі і пяткі, а абодва бакі былі завершаны вушкамі, цераз якія працягвалі шнурок. Ступні ног, уключна са шчыкалаткамі, абгортвалі анучамі, усоўвалі ў лапці і абвязвалі шнурком, завязваючы яго на вузел. Зімовыя лапці выраблялі з брызенту і гумы — матэрыялаў больш устойлівых на здзіранне. У зімовы час ногі вышэй шчыкалатак абгортвалі падвойнымі анучамі. У марозныя дні паверхні ануч спырсквалі вадою дзеля большай устойлівасці ад марозу.

Мужыкі абуваліся ў лапці, бо да гэтага прымушала іх бяда. Местачкоўцы насмейваліся з так абутых вяскоўцаў. Гаварылі, што такі залез на ліпу басанож, а злез у лапцях.

У летні перыяд усе без выключэння жыхары вёскі — дзеці і дарослыя — хадзілі басанож. Калі хто летам абуваўся, таго называлі багацеем. Басанож хадзілі вернікі ў царкву і касцёл, а толькі перад уваходам у храм абуваліся.

У маёй і навакольных вёсках большасць сялян складалі малазямельныя, якія мелі ад аднаго да шасці гектараў угоддзяў і сем'і ў 6-10 чалавек. Складана было іх пракарміць — не было заводаў, не было магчымасцей зарабіць грошы. Дзеці беднякоў пасвілі дабытак у багатых. Дарослыя за марную зарплату наймаліся служкамі і парабкамі ў багатых сялян, гаёвых, ляснічых і святароў. Калі хто ў вёсцы закончыў чатыры класы пачатковай школы, таго лічылі вучоным. 90% вясковага насельніцтва не ўмела пісаць. Пасля 1945 года ўлады Польскай Народнай Рэспублікі далі працу, адукацыю і грошы. Лапці канулі ў забыццё.

Пётр АХРЫМЮК

Вось дык штука!..

Рашыў я наведаць швагра ў Варшаве. „Прыязджай, калі выгадна, — сказаў жончын брат па тэлефоне. — Падкажы, калі прыедзеш. Сустракаць буду".

Выбраў я сайт з раскладам язды для станцыі Чаромха. І тое, што я ўбачыў, амаль з крэсла мяне не зваліла. На партале „Врота Падляся" віднеў запіс: Rozład jazdy pociągów st. Czeremcha ważny od 10.12.2006 — 8.12.2007 r. — korekta od 1.02.2007. Вось дык штука! Заглянуў я на сайт Чаромхаўскай гміны. Там быў Rozkład jazdy PKP — 8.02.2010. Але і тут нічога я не даведаўся, бо інфармацыя абмяжоўвалася адно да тэлефоннай сувязі з Агульнапольскай інфа-лініяй аб раскладах язды ПКП і Рэгіянальных перавозак.

Пашукаў я яшчэ ў інтэрнэце сайтаў з раскладамі язды з Бельска-Падляшскага і Беластока. У абодвух выпадках інфармацыі былі актуальныя. Расклад язды з Бельска можна знайсці на сайце „Газеты вспулчэснай", а Беластока — на сайце станцыі ПКП Беласток.

Няўжо так цяжка актуалізаваць інфармацыю на „Вротах Падляся", а тым больш на сайце Чаромхаўскай гміны? Усё ж такі хтосьці адказвае за гэтыя справы і бярэ за гэта грошы.

Уладзімір СІДАРУК

Беларускасць то прэстыж

Пасля праверкі конкурсных работ аказалася, што з агульнага ліку 34 удзельнікаў ажно 31 асоба стала лаўрэатам, набіраючы прынамсі 80% магчымых да здабыцця балаў. Максімальную колькасць, 51 бал, набралі Вольга Мазурук і Дар'я Вапа з Гімназіі № 7 у Беластоку і Дар'я Шыманюк з Гімназіі № 2 у Гайнаўцы. 50 балаў здабылі Марыя Масальская з Гімназіі № 3 у Бельску-Падляшскім, Паўліна Ваўранюк з Гімназіі ў Нарве і Аляксандра Конюх з Гімназіі № 7 у Беластоку, а 49 балаў набралі Рафал Адам Асташэўскі з Гімназіі ў Чыжах, Дамініка Раманюк і Моніка Хадакоўская з Гімназіі ў Дубічах-Царкоўных. Найбольш, бо 7 асоб, здабыла званне лаўрэата з Гімназіі № 3 у Бельску-Падляшскім, 6 вучняў — з Гайнаўскай белгімназіі, 4 гімназісты — з Гімназіі № 7 у Беластоку і 4 асобы сталі лаўрэатамі з Гімназіі ў Нарве.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Ваяводскія элімінацыі Прадметнага конкурсу па беларускай мове, якія адбыліся 28 лютага ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім, завяршыліся поспехам выдатнай большасці ўдзельнікаў. З ліку 34 асоб, што прыступілі да фінальных змаганняў, ажно 31 вучань стаў лаўрэатам. Званне лаўрэата гэта не толькі прэстыж, але і канкрэтныя прывілеі. Пераможцы маюць магчымасць паступаць у самыя лепшыя школы ў іх наваколлі — у Гайнаўскі і Бельскі белліцэі ды III Агульнаадукацыйны ліцэй у Беластоку, у якіх вядуцца ўрокі беларускай мовы.

Настаўніца беларускай мовы з Гімназіі № 7 у Беластоку Іаанна Васілюк сказала, што беластоцкія гімназісткі ў час зімовых канікулаў самі тэлефанавалі ёй і дапытваліся пра тэрміны сустрэч з мэтай замацоўвання ведаў перад конкурсным спаборніцтвам, бо хацелі як найлепш падрыхтавацца да фінальных змаганняў. Іншыя настаўніцы таксама доўга працавалі са сваімі гімназістамі па матэрыяле, які трэба было прааналізаваць перад ваяводскімі элімінацыямі.

Многія ўдзельнікі конкурсу справіліся з тэстам перад вызначаным часам. Выйшаўшы з гімнастычнай залы, размаўлялі з сябрамі і настаўніцамі аб складаных задачах і практыкаваннях. Хаця задачы не былі асабліва складанымі, то калі паяўляліся сумненні, дык найчасцей тычыліся пытанняў па літаратуры.

— Больш складана было напісаць дыялог і адказаць на пытанні наконт паэмы „Курган". Мы найбольш рыхтаваліся па граматыцы, а большасць задач тычылася літаратуры, — заявілі Агата Антасюк і Магда Леановіч з Гімназіі ў Дубінах. — Мы збіраемся паступаць у Гайнаўскі белліцэй і калі б атрымалі званне лаўрэата конкурсу, ужо ведалі б, што будзем туды прыняты. Навука ў гэтай школе — наша сямейная традыцыя. Мы ведаем, што ў ліцэі добра рыхтуюць да матуральных экзаменаў.

— Я рыхтавалася многа і таму без страху пісала тэст. Цяжэй было справіцца з задачамі па літаратуры і з моўнымі практыкаваннямі, — гаварыла Сільвія Якубоўская з Гімназіі № 3 у Бельску-Падляшскім.

Дзяўчатам з Гайнаўскай белгімназіі цяжэй было справіцца з задачамі па літаратуры, а найбольш складана было зрабіць пераклад з польскай мовы на беларускую. Вучаніцы з Гімназіі ў Нараўцы ў агульным назвалі тэст лёгкім, а найбольш баяліся памылак пры апісанні вясны, бо страта балаў за памылкі магла б перашкодзіць у атрыманні звання лаўрэата. Найбольш палюбілі літаратуру гімназісткі з Беластока.

— Добра, што ў тэсце больш было задач па літаратуры. Мы многа паўтаралі і таму конкурс быў нам лёгкім, — сказалі дзяўчаты з Гімназіі № 7 у Беластоку Дар'я Вапа і Аляксандра Конюх. — Калі б мы сталі лаўрэатамі, тады паступілі б у III Агульнаадукацыйны ліцэй у Беластоку.

За гімназістаў хваляваліся іх настаўнікі. Спачатку чакалі яны непадалёк ад гімнастычнай залы, дзе праходзіў конкурс, а калі вучні выйшлі, распытвалі іх як справіліся з тэстам.

— Рыхтуючы вучняў да конкурсу мы звярталі ўвагу на ўсё, што было ў перадконкурснай праграме, нават на розныя дэталі, каб нічога не абмінуць. Нашы вучні многа практыкаваліся па граматыцы, выконвалі задачы на лічэбніках і займенніках, — сказала настаўніца беларускай мовы з Гімназіі ў Чыжах Вера Флёрчук.

— Сёлетняя конкурсная праграма не была складанай, толькі прыстасаванай да ўзроўню навучання гімназістаў, — сказала настаўніца беларускай мовы з Гайнаўскай белгімназіі Анна Каліноўская.

Настаўніца з Гімназіі ў Нарве Ніна Абрамюк заявіла, што не паспела дакладна займацца па ўсіх пытаннях праграмы і таму моцна хвалявалася за вучняў. Аднак, як пасля аказалася, дарэмна, бо ўсе яе гімназісты сталі лаўрэатамі. Нарваўскія пераможцы заявілі, што будуць паступаць у Бельскі і Гайнаўскі белліцэі і ў выбраны імі ліцэй у Беластоку.

— Тэст цікавы, але былі ў ім сюрпрызы, з-за чаго вучні маглі нарабіць памылак, — сказала старшыня конкурснай камісіі Валянціна Бабулевіч і звярнула ўвагу на вялікае зацікаўленне прадметным конкурсам па беларускай мове. — Некаторыя гімназісты за званне лаўрэата на працягу трохгадовай гімназічнай адукацыі змагаюцца нават тройчы. Гэта сведчыць, што ім вельмі залежыць на гэтым званні.

Настаўніцы беларускай мовы Ніна Куптэль з Гімназіі ў Дубінах і Людміла Грыгарук з Гімназіі № 2 у Гайнаўцы патлумачылі, што многія гімназісты прыступаюць да прадметнага конкурсу па беларускай мове на школьным узроўні, а да фінальных змаганняў даходзяць ужо толькі самыя лепшыя вучні. Інакш справа мелася ў Гімназіі № 7 у Белстоку, дзе адносна мала вучняў ходзіць на заняткі беларускай мовы, а з якой, як пасля аказалася, ажно 4 асобы сталі лаўрэатамі. Козырам беластоцкіх вучняў было, між іншым, чытанне дома беларускіх кніжак, якія не ўключаны ў састаў абавязковай школьнай літаратуры. Настаўніца беларускай мовы і старшыня камісіі Валянціна Бабулевіч падкрэсліла, што вельмі важнай справай з'яўляецца начытанасць вучняў, без чаго іх лексічны запас бывае мізэрны.

— Заняткі беларускай мовы ў нашай школе адбываюцца пасля абеду і складана арганізаваць дадатковыя сустрэчы. Мае вучаніцы тэлефанавалі мне ў час зімовых канікул і дамаўляліся на спатканні, каб рыхтавацца да ваяводскіх элімінацый, — сказала настаўніца Іаанна Васілюк з Гімназіі № 7 у Беластоку.

— У агульным вучні добра справіліся з конкурснымі задачамі. Толькі пераглянуўшы тэст я баялася, што гімназісты могуць страціць больш балаў з-за моўных памылак, але мае боязі не пацвердзіліся. Наогул вучні ўдала апісвалі вясну і правільна састаўлялі дыялогі. Крыху клопатаў было з перакладам тэксту з польскай мовы на беларускую, але гэта не мела вялікага ўздзеяння на канчатковы вынік змаганняў. Не было такіх задач, з якімі цяжка было б справіцца многім вучням. Мала было практыкаванняў па граматыцы і вучні найчасцей удала спраўляліся з імі, правільна падбіраючы лічэбнікі, ці „ў" або „у", — сказала пасля завяршэння праверак старшыня конкурснай камісіі Валянціна Бабулевіч.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

ЦЭНТР АДУКАЦЫІ І ПРАМОЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ „ШЧЫТЫ”

Задума адкрыць у будынку былой школы ў Шчытах Цэнтр адукацыі і прамоцыі беларускай культуры выйшла ад маладых людзей са Звязу беларускай моладзі, але магла быць рэалізаваная толькі дзякуючы падтрымцы мясцовага грамадства і самаўрада Арлянскай гміны. Гэта яны далі згоду на рэалізаванне важнай для беларусаў Беласточчыны ідэі і за невялікай платай перадалі мураваны будынак на ўласнасць беларускай арганізацыі. Хаця галоўнае фінансаванне інвестыцыі прыйшло з Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, то ў час збірання ўласнага ўкладу ініцыятыву ЗБМ падтрымалі прадпрымальнікі і звычайныя людзі добрай волі. Гасцямі ў час адкрыцця Цэнтра адукацыі і прамоцыі беларускай культуры „Шчыты”, якое адбылося 5 сакавіка, былі прадстаўнікі Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі — Дабеслаў Жэмянеўскі і Яраслаў Малэцкі, іншыя спонсары, намеснік маршалка Падляшскага сейміка Валянцін Карыцкі, намеснік прэзідэнта горада Беластока і заадно дарадчык прэзідэнта РП Аляксандр Сасна, бельскі віцэ-стараста Пётр Божка, войт Арлянскай гміны Пётр Сэльвесюк, мясцовыя радныя і солтысы, людзі культуры і адукацыі, а таксама шматлікія прыхільнікі новай ідэі ЗБМ. Урачыстае мерапрыемства распачалося з супольных малітваў і асвячэння будынка настаяцелем Шчытоўскага прыхода айцом Іаанам Сцепанюком.

— У гэтым будынку спачатку дзейнічала школа, пасля ў адной зале была вясковая святліца, а ў большай ладзіліся забавы і сямейныя ўрачыстасці. На маім вяселлі танцы таксама былі ў гэтым будынку. А пасля стаў ён моцна нішчэць і тут быў садом і гамора. Я выступіў да нашага войта Добаша з прапановай адкрыць тут пункт прыёму малака і вясковую святліцу, але войт памёр і гэтая ідэя прапала. Трэба, каб цяпер адрамантаваны будынак як найбольш служыў людзям, — першым пасля асвячэння будынка выступіў айцец Іаан Сцепанюк і ўручыў старшыні Звязу беларускай моладзі Міхасю Сцепанюку ікону свяціцеля Мікалая, аднаго са шчытоўскіх заступнікаў. Дырэктар Музея малой айчыны ў Студзіводах Дарафей Фіёнік распавёў пра цікавую і багатую гісторыю Шчытоў, звяртаючы ўвагу на поспехі ў галіне культуры і сельскай гаспадаркі ў пачатку XX стагоддзя.

— Шчыты мелі шчасце да асоб, якія аддавалі свой талент і час дзеля развіцця тут культуры, — сказаў Дарафей Фіёнік. — Вы будзеце не пачынальнікамі, а прадаўжальнікамі таго, што рабілася ў Шчытах у мінулым. Напрыклад, дзеяч ЗБМ Пётр Астасевіч гэта ўнук Георгія Астасевіча, вядомага шчытоўскага дзеяча ў мінулым.

— Мы хочам, каб маладыя беларусы маглі тут сустракацца з маладымі палякамі і супрацоўнічаць. Будзем намагацца пераканаць нашых маладых беларусаў, што наша нацыянальнасць гэта не пагроза для іх будучыні, толькі шанц і багацце, — гаварыў каардынатар праекта ЗБМ Ігар Лукашук і запрашаў усіх да супрацоўніцтва з цэнтрам. Звяз беларускай моладзі хоча закончыць у сваім будынку рамонт другога паверха, а пазней прыстасаваць яго наваколле таксама для патрэб шчытоўскага цэнтра.

— Мы плануем выкарыстаць будынак для адукацыйных праграм і прамоцыі беларускай культуры. У нашым цэнтры будзе дзейнічаць таксама вясковая святліца, а ў ёй будуць ладзіцца, між іншым, мерапрыемствы для жыхароў Арлянскай гміны, — сказаў старшыня ЗБМ Міхась Сцепанюк.

— Перш за ўсё ў гэтым будынку мы будзем арганізаваць культурную дзейнасць. Плануем пасля багаслужбаў у непадалёк распаложанай царкве ладзіць у нас спатканні пад лозунгам „Традыцыя, сучаснасць, будучыня”, на якія хочам запрашаць цікавых людзей. У час планавання тэм сустрэч будзем слухаць падказак людзей. Прадбачваем арганізаваць тут тэатральныя выступленні ў рамках праекта „Сцэна Шчыты”, на якія хочам запрашаць школьнікаў і астатнюю моладзь з Арлянскай і навакольных гмін. Восенню плануем наладзіць у Шчытах святкаванне юбілею 20-годдзя дзейнасці ЗБМ. Плануем таксама арганізаваць у нашым цэнтры выстаўку з Падляшскага культурнага шляху „Дрэва і сакрум”. Запрашаем усіх ахвотных да супрацоўніцтва з намі, — расказвала Іаанна Стэльмашук з ЗБМ.

Арганізатары мерапрыемства дзякавалі ўсім спонсарам, дарадчыкам і памагатым за матэрыяльную і духовую падтрымку і ўручалі ім нестандартныя падарункі — па адной цэгле.

— Я спачатку не верыў да канца, што ў гэтым будынку ўзнікне Цэнтр адукацыі і прамоцыі беларускай культуры, але мяне абдзяляў аптымізмам бельскі віцэ-стараста Пётр Божка. Тут ёсць месца, дзе будзе таксама спатыкацца мясцовае грамадства. Мы таксама першая гміна, дзе восенню будуць усталяваны ўказальнікі з назвамі мясцовасцей на польскай і беларускай мовах, — гаварыў арлянскі войт Пётр Сэльвесюк.

Начальнік аддзялення нацыянальных і этнічных меншасцей Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі Дабеслаў Жэмянеўскі таксама сказаў, што калі заглянуў у вельмі моцна знішчаны будынак былой школы спачатку засумняваўся ў тым, ці ЗБМу ўдасца адкрыць у ім культурную ўстанову.

— Калі нам перадалі школьны будынак, ён быў вельмі моцна знішчаны. Былі тут разбітыя вокны і дзверы. Спатрэбілася многа працы, каб будынак давесці да парадку, — сказаў каардынатар праекта Ігар Лукашук. — Прадбачваем адчыніць у нас пункт культурна-турыстычнай інфармацыі, каб турысты знаёміліся не толькі з зубрамі і Белавежскай пушчай, але таксама з гісторыяй, традыцыямі і культурай пражываючых тут беларусаў. У наш прыгожа распаложаны цэнтр зручны даезд, бо знаходзіцца ён пры дарозе з цэнтральнай Польшчы ў Белавежу.

Праз Шчыты праходзяць два турыстычныя шляхі „Царскі гасцінец” і „Дрэва і сакрум”, а сам цэнтр распаложаны ў вельмі прыгожым месцы, побач даўняй будоўлі, драўлянай царквы і вялікіх старых дрэў. Арганізатары цэнтра заклікаюць падтрымаць фінансава дзейнасць ЗБМ у Шчытах і рамонтныя работы, якія трэба будзе яшчэ выканаць. Дзеля гэтага можна будзе купляць цаглінкі і пералічваць ахвяраванні на банкаўскі рахунак:

(Związek Młodzieży Białoruskiej, PKO BP, Oddz. Bielsk Podlaski 32102013320000120206693685),

з прыпіскай „На Цэнтр адукацыі і прамоцыі беларускай культуры”.

Выбары солтыса ў Кузаве

24 студзеня ў Кузаве адбыўся вясковы сход, на якім выбралі солтыса. На агульны лік 172 жыхароў у сходзе ўдзельнічалі 34 асобы. Гміну прадстаўлялі войт Юры Шыкула, намеснік войта Ірыней Леанюк, сакратар гміннай управы Марыя Іванюк і скарбнік Міраслава Кандрацкая-Найбук, а вёску — солтыс Раман Бішчук і радная Альжбета Каліноўская. Абавязкі пратакаліста выконвала Галіна Баранаў.

Кіраванне сходам даручылі Раману Бішчуку, які прывітаў гасцей і пазнаёміў з парадкам пасяджэння. Пасля солтыс даў справаздачу: расказаў аб справах, якімі займаўся ў перыядзе сваіх васьмігадовых паўнамоцтваў. Для выбару солтыса была створана падліковая камісія: Ніна Саласцюк — старшыня, Міраслава Кандрацкая-Найбук і Мікалай Саўчук — члены. На солтыса прапанавалі трох кандыдатаў: Васіля Панасюка, Марыю Бішчук і Віктара Сідарука. Пакуль камісія займалася падрыхтоўкай бюлетэняў для галасавання, голас узяў войт Юры Шыкула, які пазнаёміў з планавымі інвестыцыямі на бягучы год.

— Асноўнай задачай, — сказаў прамоўца, — з'яўляецца заканчэнне пабудовы санітарнай каналізацыі з пагранперахода ў Ставішчы і падключэнне да ачышчальні сцёкаў у насычальні. Апрача таго будзе праведзены рамонт святліц у Кузаве і па вуліцы Фабрычнай у Чаромсе. Апрацуем тэхнічную дакументацыю на правядзенне каналізацыі Ставішчы — вул. Вішнёва — Кузава. На больш гміна не можа разлічваць, паколькі вымушана пагашаць банкавыя крэдыты, каля пяці мільёнаў зл.

У час тайнага галасавання солтысам быў выбраны Васіль Панасюк — атрымаў 16 галасоў (Марыя Бішчук — 11; Віктар Сідарук — 7). Была выбрана Салэцкая рада: Ежы Васілюк — старшыня, Мікалай Саўчук с. Васіля, Віктар Сідарук і Аляксандар Саўчук — члены. Усе яны атрымалі па 32 галасы.

У бягучых справах краналіся справы ўтылізацыі шыферу і гаспадаркі адходамі. Намеснік войта Ірыней Леанюк паінфармаваў, што здыманнем шыферу з даху і ўтылізацыяй вытворчых адходаў займаюцца спецыялістычныя фірмы. За паслугу плаціў гаспадар. Сёлета і ў наступным годзе паслугі будуць выконвацца бясплатна, на кошт Аддзялення аховы асяроддзя Ваяводскай управы. Дзеля таго трэба было падаць заяву ў гміну ў тэрміне да 25 лютага.

Уладзімір СІДАРУК

Тадэвуш КУНЦЭВІЧ

Жанчынам

Не хачу вас выхваляці,
Але як было б у хаце,
Каб жыў толькі сам мужчына?
Гавару вам – смех і кпіна!
Каб ні жонкі, ані цёшчы –
Апынуўся б у Харошчы!
Бо сямейны ці ўмее
Лечыць, калі хто здурэе?
Сёння кожны муж замеціць,
Што ў хаце сонца свеціць,
Ад Балтыкі аж да Буга –
Гэта вашая заслуга:
Пасціраці, наварыці,
Адным словам – усё зрабіці.
Без найменшых тут дагадак –
Вы трымаеце парадак.
Адзін у сэрцы сакрэт маем –
Вельмі моцна вас кахаем!

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Вясёлыя канструктары і акцёры

— Пакажы, пакажы, што ты сёння прынёс! — загадвае спадарыня Альжбета.

— А гэта такая... *лятучка*, — Янка спачатку адпіраецца. Ён не ведае як назваць сваю новую цацку, якая напамінае вялікую каляровую страказу. Зрабіў яе са старых, закінутых у куток цацак. Так звычайна, з цікавасці і для забавы...

У рэшце рэшт Янка выконвае просьбу настаўніцы і сяброў, ідзе ў канец класа і запускае рухавік машынкі. Яго *верталёт* уздымаецца ўгару і лётае па-над класам. У высі выглядае як касмічны аб'ект. Ну, проста казка! Глядзім з прыадкрытымі ратамі то на *верталёцік*, то на канструктара Янку. Калі расхвальваем яго вынаходства, хлапец ажыўляецца і кажа:

— Я думаю зрабіць яшчэ такі аўтобус на электрычную або атамную энергію...

— А чаму якраз аўтобус? — здзіўляюся.

— Бо дзеці з Кузавы вымушаны хадзіць у школу пешшу. Калі цёпла, мы прыязджаем на роварах. Чатыры кіламетры. Калі зіма, нас бацькі прывозяць на машынах. А на аўтобусе было б нам усім весялей...

— Так, так! — пагаджаюцца сяброўкі і сябры.

Дзеці з Кузавы складаюць аснову малодшага гуртка навучэнцаў беларускай мовы ў Чаромсе. Сярод іх тры Касі, Эва, Крыстыян, Данель і Янка. Дзеткі апавядаюць пра свой спектакль, які падрыхтавалі разам са сваёй настаўніцай Альжбетай Раманчук. Паказалі яго на школьнай ёлцы і ў час карнавальнага свята ў Гмінным асяродку культуры ў Чаромсе. Іх спектакль „Пра Піліпку сынка і ведзьму" горача ўспрыняла публіка, усе іх хвалілі і пыталі пра наступныя пастаноўкі.

— Я быў кавалём, — кажа малады канструктар Янка Алямпіюк, — выкаваў ведзьме і яе кату Гаргусю язык, каб у іх патанчэў голас!

— Цікава?

— Ну, але той язык не быў праўдзівы, — паясняе малады канструктар. — Я выкляпаў такі гальштук, які ў спектаклі быў замест языка...

Канструктар і каваль Янка Алямпіюк — жартаўнік! Ён часам тэстуе свае новыя лятучыя *аб'екты* ў час урокаў, калі ніхто не спадзяецца... такога цуда. Тады ў класе ўсе напалоханыя, а пасля — вясёлыя...

У час знаёмства з сябрамі з Чаромхі трэба прыгадаць славутага інжынера-канструктара Дзмітрыя Шатыловіча. У гэтым годзе адзначаем 85-годдзе славутага ўраджэнца Чаромхі. У пасляваенны час ён будаваў самыя вялікія электрастанцыі ў Польшчы, Індыі і Югаславіі. Дзмітры Шатыловіч таксама беларускі паэт, член Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа". Хоць ён жыве ў Варшаве, ніколі не парваў сувязі з роднай Чаромхай і роднай беларускай мовай.

Фота Ганны Кандрацюк

Малодшы беларускі гурток з Чаромхі: Стаяць: ***Кася Пахвіцэвіч, Крыстыян Баран (першы злева ў другім радзе), Янка Алямпіюк, Данель Кулік. У трэцім радзе: Альжбета Раманчук, Эва Панасюк, Кася Назарук, Кася Салінская***

Яўдакея сокі збірае!

(з народнага календара)

У народных павер'ях і замовах ад хвароб часта карыстаюцца чалавечай слінай. У ёй, паводле продкаў, скрывалася вялікая моц (сёння, паводле сліны, можам праверыць ДНК, наш кроўны код). Вось з дапамогай чалавечай сліны можна было наклікаць зіму!

13 сакавіка, *Васіля.* У гэты дзень можна было прасці толькі тую воўну, якую не трэба слініць. Нельга было прасці лён і пяньку, бо такім чынам можна *адслініць замураваную ўжо зіму. У след непавагі да рытуалу вернуцца маразы і завеі.*

14 сакавік, *Яўдакеі*. На Магілёўшчыне прыкмецілі, што калі на *Яўдакеі* свеціць сонца і капае са страхі, вясна будзе цёплай і ўраджайнай на сена. Дождж абяцаў ураджай на жыта. Імгла прадказвала ўраджай на гарох, боб, фасолю. Калі ў гэты дзень быў мароз, на весну, у час цвіцення, вымерзне грэчка. Калі была мяцеліца, год будзе халодны!

У гэты дзень жанчынам таксама нельга было прасці, дазвалялася адно сукаць гатовыя ніткі. Нельга было карыстацца нажніцамі (калі была такая неабходнасць, трэба пакарыстацца авечымі нажніцамі). Вельмі часта на Яўдакею земляробы ўвогуле не працавалі — *каб не прагневаць пакутніцы, якая трымае ў руцэ лета.* Пачыналі таксама гукаць вясну: *Гэй вясна, гэй красна. Закідай сані. Ды едзь калёсамі.* Яўдакея, верылі людзі, сокі збірае. Таму неабходна кантраляваць сваю сліну, каб не наводзіць закалоту ў прыродзе.

Галерэя ЗОРКІ

Фота Ганны Кандрацюк

1. Імя і прозвішча: Эва Панасюк (IV клас ПШ у Чаромсе).

2. Твой любімы прадмет: беларуская мова, урок мастацтва.

3. У жыцці хачу стаць: ветэрынарам.

4. У сяброў цаню: сімпатычнасць і сяброўства.

5. Не люблю: калі хлопцы б'юцца і празываюцца, калі маняць у жывыя вочы.

6. Па-беларуску размаўляю з: бабуляй, часам з татам.

7. Кніжка, якая цябе захапіла: «Кніга джунгляў».

8. Падабаецца табе музыка: поп-музыка.

9. Твае ўлюбёныя стравы: марожанае, салаткі.

10. Твой любімы спосаб адпачынку: люблю слухаць музыку і іграць на камп'ютары. Найбольш падабаюцца мне гульні, дзе трэба праектаваць адзенне для дзяўчат.

11. Калі дарасту хачу жыць: у Белавежы, бо там многа звяроў.

Дзед Тадэвуш для Наты і Тоні

Дзед Тадэвуш Кунцэвіч жыве ў Лешуках Нараўчанскай гміны. Быў ён ляснічым і настаўнікам, у старой школе ў Лешуках. Дзеці са школы ў Нараўцы (сюды цяпер ходзяць дзеці з Лешукоў, Церамкоў, Міхнаўкі) ведаюць дзеда Тадэвуша — ён час ад часу ездзіць з імі ў гімбусе, які давозіць іх у школу. Дзед Тадэвуш — вясёлы. Ён выдумляе вершы і расказвае іх дзецям. Ёсць у яго дзве свае ўнучкі — адна вучыцца ў чацвёртым класе ў Нараўцы — Наталля, а меншанькай — Антаніне — толькі дзевяць месяцаў. Ім таксама тыя вершыкі чытае дзед Тадэвуш. Пазнаёмцеся і вы. **(лук)**

Дыктоўка

Робіць мішка падрыхтоўку:
напісаць звярам дыктоўку.
Купіў сшыткі і алоўкі,
і садовіць да дыктоўкі.
Не такая справа проста!
Пасадзіў усіх па росту,
у лапу ўзяў вяліку тубу,
а ў другую – доўгу хлюбу!
Вось злякаліся звярочкі –
мамы, таты, сыны, дочкі –
вось тут будзе ўжо рабіцца!
Як мядзведзя нам пазбыцца?
– Я малая! – кажа пчолка, –
не баюся нават воўка!
Адгадайце, што зрабіла?
Проста ў нос яго ўкусіла!
Уцёк мішка ў сваю хату,
з плачам скардзіць маме, тату:
– Я ўжо знаю напралёт:
то быў, пэўна, самалёт!

Сабачка і коцік

Коцік выклікаў сабачку
ў лес пагуляць.
Адным словам – на прагулку
найпрасцей сказаць.
Ішлі доўгаю дарогай,
пакрай поля, рэчкі...
На балоце побач лесу
пасліся авечкі.
Глянуў коцік і сабачка
той не без трывогі:
– Гэта, мусіць, не авечка?..
Яна мае рогі!
Як пусціўся бараніска!
Давай, бедных, гнаць!
Павярнуліся назад,
сталі ўцякаць.

Так, так!

Казка з Ірана

Хутка станеш багатым, калі будзеш мець спрытны план.

У далёкай Персіі жыў калісьці стары чалавек. Адно, што яму належыла, дык гэта папугай, якога ён атрымаў аднойчы ў падарунак. Папугай не быў вельмі мудры. Патрапіў гаварыць толькі словы „так, так". Бядняк вырашыў узбагаціцца на яго „таленце". Стары пазычыў у свайго багатага суседа тры манеты і ноччу пайшоў у горад. Тут, на рыначным пляцы, у трох розных месцах закапаў грошы. На другі дзень, якраз гандлёвы, стары прыйшоў са сваім птахам на рынак. Пасля малой нарады з папугаем дастаў рыдлёўку. Людзі, не ведаючы, што ён робіць, абступілі яго.

— Скажы мне, дарагі сябар, ці тут мне капаць? — запытаўся гаспадар у папугая.

— Так, так, — адказаў птах.

Ашаломленыя людзі не паверылі, калі бядняк паказаў ім знойдзеную манету. Стары дакладна гэтак сама зрабіў яшчэ два разы, заўсёды найперш раячыся з птахам.

Вестка пра цудоўнага папугая хутка разышлася па горадзе. Яшчэ ў той самы дзень перад хатай старога стаяла вялікая чарга людзей, якія хацелі купіць птаха. Новым ўладальнікам „так-така" стаў адзін багацей. Знайшоўшы адпаведнае месца, ён спытаўся свайго крылатага дарадцу:

— Скажы, ці тут мне капаць?

— Так, так, — пачуў.

Капаў ён доўга, але ніякай манеты не знайшоў. Зрабіў яшчэ некалькі спроб узбагаціцца дзякуючы папугаю, ды зразумела, дарэмна. Стомлены ад работы, прысеў і пачаў гаварыць з птахам.

— Ці я такі дурань? Ці я даўся ашукаць сябе першаму лепшаму чалавеку?

— Так, так, — адказаў папугай.

Віялета Нікіцюк-Пэркоўская

www.travel.latimes.com

Музыка з кайфам

Працаваць, верыць, кахаць: „The Toobes"

Калі хочаце зрабіць музычную кар'еру, рэцэпт для вас мае таленавіты, адзін з цікавейшых беларускіх, маладых гуртоў.

„The Toobes" паказаліся з як найлепшага боку яшчэ ў 2009 годзе, калі запрэзентавалі свой дэбютны альбом „Hello". Альбом, рашэннем журы прэміі Experty.by, здабыў званне лепшага дэбютнага альбома, лепшага рок-альбома ды лепшага беларускага альбома 2009 года. Нібыта ўсё о'кей, але некаторым не прыйшло даспадобы тое, што музыкі не спяваюць і не гавораць па-беларуску. Гэта аднак вельмі асабістае пытанне: чаму? А чаму большасць грамадства не гаворыць па-беларуску, а маладым адмаўляецца права на спяванне па-англійску, калі вядома, што гэта міжнародная мова, якая адкрывае дзверы шматлікім да кар'еры: ці яны з Беларусі, ці з Нямеччыны, ці са Швецыі? Нягледзячы на нішто, хлопцы спяваюць па-англійску, а адчыняюцца на іх не толькі дзверы, але і вокны, хочацца сказаць, бо здабываюць папулярнасць не толькі на радзіме, але і ў чарговых еўрапейскіх краінах. Апошнім часам здабылі сэрцы публікі ў Беластоку, дзе выступілі на фестывалі незалежнага мастацтва „Underground.pl".

— Не толькі здабылі ўжо шмат прызоў, але і граюць з вялікай энергіяй, — кажуць арганізатары фестывалю. — Трох музыкаў на сцэне, а за імі сцяна гуку.

Гэта гаворыць само пра сябе. Лепшых рэцэнзій не трэба, але калі зазірнуць у інтэрнэт, то сустрэнем толькі станоўчыя ацэнкі слухачоў. Нават калі, паводле публікі, канцэрт не ў ста адсотках дапрацаваны, яны і так пераконваюць слухача і ён верыць, што так мае быць. Яны здаюцца проста быць сапраўднымі. Апошнім часам „The Toobes" паганарыліся новым кліпам і зноў паяўляюцца галасы, што гэта зусім еўрапейскі кліп і еўрапейскі гурт. І не трэба ўспрымаць гэтага як крытыку беларускасці, толькі пахвалу якасці. Бо самі музыкі ад сваёй беларускасці не адмаўляюцца, пра што сказалі мне ў інтэрв'ю, якое далі перад беластоцкім канцэртам. Што цікава, размова вялася на беларускай мове і праз тыдзень зможаце яе прачытаць у „Музыцы з кайфам".

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 11

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 7:

Смак, Віктар, ер, рой, пчолкі, Іран, анёл, мыла, лязо, букет. След, імя, прыз, крона, стол, майка, ар, інок, палёт.

Узнагароды, беларускі комікс **Дзікае паляванне караля Стаха**, выйгралі **Магдалена Сцепанюк, Малгажата Рошчанка, Кацярына Верамяюк** з Бельска-Падляшскага, **Караліна Васілюк, Дарота Артышук** з Гайнаўкі, **Эльвіра Швед, Марлена Багацэвіч, Юстына Здановіч, Кася Куптэль, Марта Лемеш** з Орлі. Віншуем!



АБ БЕЛАРУСКІМ ВАВЕЛІ

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Злева Януш Корбель і Міраслаў Пякарскі

Аб Белавежскай пушчы вялася размова ў час чарговай сустрэчы ў дыскусійным клубе Згуртавання АБ-БА. У гэты раз героем быў Януш Корбель, аселы ў Белавежы эколаг, журналіст, фатограф, па прафесіі архітэктар. „Гэтых людзей маніпулююць", — так гаварыў аб самаўрадах і жыхарах прыпушчанскіх гмін, што супрацьлеглыя пашырэнню Белавежскага нацыянальнага парку.

— Гэта чалавек-аркестр, — так прадставіў Януша Корбеля вядучы сустрэчу ў беластоцкай Пачатковай школе № 4 тэлежурналіст Мікола Ваўранюк.

— Белавежская пушча з'яўляецца для палякаў адной з важнейшых тэм. Ад таго, што будзе з гэтым лесам, залежыць тое, што будзе з намі і нашымі дзецьмі. Пушча заўжды была для мяне магічнай. Мая айчына была тут, — расказваў сам Януш Корбель.

Не скрываў, што ён — ветэран экатэрарыстаў:

— Удалося нам давесці да таго, што ахоўная зона Белавежскага нацыянальнага парку была пашырана ўдвая — з сямі да чатырнаццаці працэнтаў.

І пытаўся, здавалася, рытарычна:

— Хто тут тэрарыст? Бульдозер, што гэты лес знішчае, ці тыя, што гэтага лесу бароняць?

З сумам прызнаваўся:

— Гэты беларускі Вавель хранічна знішчаецца. Захоўвалі яго каралі. Ад XII стагоддзя была забарона ўваходу ў гэты лес. Толькі князі і каралі маглі тут паляваць. Захаваўся ён аднак не дзякуючы любові каралёў, а таму, што наўкола была багна. Не было магчымасці сплаўляць драўніну, таму там узнікла каралеўская паляўнічая акруга.

Прыгадаў:

— Пушча гэта лес, якога ніхто не пасадзіў, які сам адраджаецца. Тут вырашае натура, а не план створаны чалавекам. Гэта адзіны такі лес у Еўропе, а нават у свеце. У ЗША ёсць падобны лес, але яго толькі 500 гектараў.

Аб пазіцыі мясцовага насельніцтва наконт пашырэння Парку сказаў:

— Мне здаецца, што 99 працэнтаў з іх не было ў запаведніку і думаюць, што там проста нічога няма. Лакальнай гарамадскасці ўчынена многа зла, бо выкарыстоўваюць яе да нейкіх палітычных гульняў. Унушаецца ім, што эколагі робяць усё, каб яны не мелі драўніны.

Тут прывёў інфармацыю аб тым, што ў шэсць разоў больш вырэзваецца дрэў у пушчы, чым гэта неабходна на патрэбы рэгіёна.

Януш Корбель паказаў „тое, чаго няма", значыцца, чорна-белыя слайды са строга ахоўванага абшару (баяўся рабіць каляровыя здымкі гэтаму шматкаляроваму свету). Нейкім каментарам да пушчанскай сітуацыі быў фільм кракаўскага тэлебачання „Што з гэтай Пушчай?", зрэалізаваны па заказе міністра асяроддзя, які канчаўся сказам, здавалася б, банальным: „Каб вырасла новае дрэва, трэба сто або больш гадоў".

Януш Корбель пераконваў і да неабходнасці змены закону, які адносіцца таксама да Белавежскай пушчы, а ў справе якой акцыю збірання подпісаў пад адпаведнай петыцыяй правяла экалагічная арганізацыя *Greenpeace*. Сабраных было больш за 200 тысяч подпісаў. Гаворка пра тое, каб згоду на пашырэнне нацыянальных паркаў не давалі самаўрады, а ўрад:

— З таго часу, калі для гэтага патрэбная згода самаўрадаў, не быў пашыраны ў Польшчы ніводзін парк, а гэта нацыянальная маёмасць і адказнасць за яе ляжыць на ўрадзе. Цяпер паркі не нацыянальныя, а гмінныя. У сувязі з прапановамі пашырэння Белавежскага парку былі грошы на інвестыцыі, але гміны занялі пазіцыю: „Не, бо не!" (...). Абвінавачваюць нас у тым, што хочам адабраць самаўрадам іх лясы, а яны ж дзяржаўныя, а не іхнія. Патрабуем таго, каб непатрэбная была згода самаўрадаў, толькі кансультацыі з самаўрадамі. Прытым не трэба канстультацый трактаваць як пазбаўленне самаўрадаў уплыву на прыманне рашэнняў.

Януш Корбель, заснавальнік Майстэрні дзеля Усіх істот, не скрываў, што з'яўляецца прыхільнікам учынення ўсяе Белавежскай пушчы абшарам аховы ў выглядзе Нацыянальнага парку, паколькі тут жывуць незвычайныя экземпляры дрэў, лішайнікаў, насякомых...

— Паўсюднай з'яўляецца няпраўда ў справе Пушчы, якую выказваюць нашы самаўрадаўцы. Пушчанскія гміны маглі б спакойна жыць з турызму. Лічыўшы, скажам, білеты за наведванне Белавежскага нацыянальнага парку, які ў год наведвае каля 200 тысяч турыстаў.

З залы клуба згуртавання АБ-Ба прагучала:

— Ніводзін войт у справе Пушчы не будзе вырашаць без згоды жыхароў. Прытым ніводзін мясцовы жыхар не дазваляе сячы каштоўных дрэў.

Януш Корбель:

— Дыялог неабходны. Ды хто да яго павінен давесці, асабліва тады, калі гучаць аргументы: „А што, чарвяк мо важнейшы за чалавека?".

Мікола Ваўранюк:

— Гэта павінна зрабіць дзяржава.

Януш Корбель:

— Ды дзяржава [урад — М. Х.] цяпер нерашучая.

Мікола Ваўранюк:

— Кожны войт, які выказаўся б за пашырэнне парку на абшар усяе Пушчы, прайграў бы выбары, хоць некаторыя з іх кажуць прыватна, што былі б за тое.

Януш Корбель:

— Калі ў такім каштоўным агародзе, як Белавежская пушча, маецца пяцёх агароднікаў і кожны робіць пасвойму, дык той агарод будзе знішчаны. У Белавежскай пучшы павінен быць адзін гаспадар.

Лекар белавежскіх зуброў

Пётр БАЙКО

Доктар ветэрынарных навук Вячаслаў Дземяшкевіч пры жыцці быў адной з найбольш вядомых і шанаваных асоб у Белавежы. Пасля двух дзесяткаў гадоў з лішнім ад смерці доктара памяць аб гэтым незвычайным чалавеку ўжо прападае, а маладое пакаленне белавежцаў зусім яго не ведае. Напомнім тады славутага белавежскага доктара.

Вячаслаў Дземяшкевіч нарадзіўся 9 сакавіка 1907 года ў горадзе Орша, што знаходзіцца ў Беларусі, над ракой Дняпро. У трыццатыя гады закончыў Ветэрынарны інстытут у Віцебску. Пасля інстытута атрымаў пасаду кіраўніка Гельмінталагічнай лабараторыі Акадэміі навук БССР у Мінску. Спецыялізаваўся ў бактэрыялогіі і гельмінталогіі (навуцы аб паразітычных чарвяках) дзікіх звяроў. Калі ў верасні 1939 года на ўсходнія землі Рэчы Паспалітай увайшлі савецкія войскі, новыя ўлады неўзабаве прыслалі В. Дземяшкевіча ў Белавежу, давяраючы яму пасаду кіраўніка Бактэрыялагічна-паляўнічай лабараторыі і апеку над станам аховы здароўя тутэйшай запаведнай дзічыны. Быў 1940 год. Малады лекар ветэрынарыі не паспеў яшчэ перавезці з Мінска сваёй бібліятэкі, калі ўжо ў чэрвені 1941 года на гэтую тэрыторыю ўвайшлі немцы. В. Дземяшкевіч, зусім правільна апасаючыся за свой лёс, увесь месяц скрываўся ў пушчы. Аднак немцы даволі хутка даведаліся пра таленавітага савецкага ветэрынара і пастанавілі яго адшукаць. Не маючы сваіх спецыялістаў па гадоўлі зуброў, а будучы вельмі імі зацікаўлены, немцы ахвотна прынялі на працу савецкага лекара, каб клапаціўся за белавежскі зубрыны статак. В. Дземяшкевіч паспяхова выконваў свае абавязкі і шчасліва дачакаў вызвалення Белавежы. Яшчэ шмат гадоў пасля заканчэння вайны сцвярджаў, што зубры выратавалі яму жыццё.

Польскія ўлады таксама абдзялілі яго сваім даверам і ў 1944 годзе прынялі на пасаду кіраўніка Апазнавальнай станцыі хвароб лясной жывёлы Інстытута даследавання лясніцтва. Пасля ліквідацыі гэтай установы з канцом 1951 года В. Дземяшкевіч працаваў у Белавежскім нацыянальным парку, аж да часу пераходу на пенсію ў 1975 годзе. Увесь гэты перыяд трымаў жывёлагадоўчую і лекарска-ветэрынарную апеку над зубрамі ў польскай частцы Белавежскай пушчы. Апекаваўся таксама жывёлагадоўляй тарпанападобных конікаў, паспяхова спраўляючыся з паразітамі іх стрававальных органаў.

В. Дземяшкевіч паралельна, амаль да сваіх апошніх дзён, вёў ветэрынарную практыку на тэрыторыі Белавежскай гміны. Белавежцы вельмі высока цанілі яго прафесіяналізм і падкрэслівалі гэта пры кожнай нагодзе. Доктар Дземяшкевіч паспяхова спраўляўся нават з вельмі цяжкімі выпадкамі. У той самы час вёў навуковыя даследаванні. Першым у Польшчы распазнаў у людзей віруснае запаленне мазгоў пераношванае кляшчамі і апісаў яго цячэнне ў часопісе „Polski Tygodnik Lekarski" (№ 24/1952). Стараўся папулярызаваць гэтую праблему, змяшчаючы артыкул у рэгіянальнай штодзённцы „Gazeta Białostocka" (№ 150/1952). Апрача таго апісаў цячэнне родаў першага зуброня (гібрыда зубра і каровы), народжанага ў даследчым запаведніку Установы даследавання млекакормячых ПАН у Белавежы.

Актыўна ўдзельнічаў у польска-савецкіх канферэнцыях, прысвечаных зубрагадоўлі на тэрыторыі Белавежскай пушчы. Часта публічна браў слова ў справе лёсу зубра. Зразумела, што не магло абысціся без яго слова таксама і ў дыскусіі, якой пачатак паклала мясцовая прэса п.з. „Зубр а справа польская". За 35 гадоў сваёй працы ў белавежскай зубрагадоўлі накапіў ён многа цікавых назіранняў пра сваіх падапечных. Прафесар Януш Гіль у сваёй кніжцы п.з. „Zarys fizjologii żubra" (Варшава 1999) вось гэтак успамінае В. Дземяшкевіча: „(...) быў вельмі адданым справам зубрагадоўлі. Ведаў іх [зуброў] і дапамагаў мне ахвотна ў маіх даследчых пачынаннях. Удзельнічаў ва ўсіх лекарска-ветэрынарных працах і ў навуковых сходах".

Доктар Вячаслаў Дземяшкевіч памёр 20 верасня 1990 года ў гайнаўскай бальніцы. Пахаваны на белавежскім могільніку.

Па слядах бацькі пайшоў адзін з двух яго сыноў — Аляксандр Вечаслаў Дземяшкевіч, прафесар ветэрынарных навук, вядомы польскі паразітолаг, дырэктар па навуковых справах Інстытута паразіталогіі імя В. Стэфанскага Польскай акадэміі навук у Варшаве. Ён, як і бацька, займаецца даследаваннем паразітаў зуброў, а таксама некаторых іншых відаў пушчанскай дзічыны.

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Погляд праз дзірку ў плоце

Здарылася мне пабываць у гайнаўскім шпіталі. Не ў якасці нейкай важнай асабістасці накшталт носьбіта нейкай нямогласці, толькі трапіў я туды ў ролі статыста. І можна нават сказаць, што не ў шпіталь, толькі ў пачакальню прышпітальнай паліклінікі. Народу ў той пачакальні сабралася крыху менш чым прадугледжаных яму крэсел, але ўсё ж такі было там даволі людна, можа нават занадта людна калі ў якасці крытэрыю ўзяць згушчэнне там антрапагенных водараў. Мо такая канцэнтрацыя бярэцца альбо з-за таго, што прапускная моц установы памяркоўная, альбо абслугоўванне наведвальнікаў праводзіцца там вельмі скрупулёзна.

Ну, бо ж у лекара, як гэта вядома не толькі хворым, але і здаровым, адбываецца часаёмкі спектакль, у час якога наведнік, быццам кантрабандыст таможніку, паказвае гаспадару кабінета нейкі свой сакрэт, прыхаваны пад вопраткай, у роце, ці нават яшчэ глыбей, ды яшчэ пра шмат што расказвае. А лекар жа гэта ўсё мусіць запісаць у адпаведныя бланкі, бланкі пазней трапляюць у папкі, а папкі ў картатэкі. Пазней, гадамі пазней, могуць узнікнуць нейкія навуковыя інстытуты, якіх навуковыя супрацоўнікі будуць раскрываць тыя картатэкі і папкі, чытаць сабраныя ў іх бюлетэні і зноў пісаць нейкія свае высновы дзеля атрымання вучоных званняў і дзеля наступных пакаленняў навуковых работнікаў прагных такіх жа званняў. А некаторых ранейшых хворых можна будзе нават аб'явіць медыцынскімі лгунамі і назваць сімулянтамі, так як гэта адбываецца цяпер з героямі картатэк, запісаных гадамі таму санітарамі тадышняй грамадскай думкі. Заўважыць пры нагодзе варта, што тыя санітары займаліся ў прынцыпе маніторынгам за перадавікамі, менш цікавячыся аўтсайдарамі.

А я, як статыст, значыць таксама свайго роду аўтсайдар, не надта абавязаны нікому нічога паказваць дзеля запісу ў векапомныя папкі, пакінуў набалелую пачакальню і падаўся паназіраць за здароўем самога шпіталя. Выйшаў я на паляну, абмежаваную з аднаго боку Пушчай, а з другога ліпамі Ліпавай вуліцы. І глянуў я на шпітальную агароджу, вельмі акуратную. І западозрылася мне, што тая акуратная агароджа, як гэта ў нашым тутэйшым свеце з такога роду арганізмамі бывае, можа быць у сутнасці хворая, можа дзе здалёк ад паказнога вока, у нейкім сарамлівым месцы, хаваецца нейкая ейная траўма...

Доўга шукаць не давялося. Ужо на вугле відаць адсутнасць адной з металічных планак, аднак там адтуліна яшчэ не апрацаваная і пранікнуць цераз яе мне не ўдалося. Метраў мо дваццаць-трыццаць далей, ужо пранікнуўшы ў Пушчу, знайшоў я тое, на што спадзяваўся — цалкам гуманны праём без адной планкі. Паспяхова я яго праверыў на магчымасць уваходу і выхаду на шпітальную тэрыторыю і назад. Каму і навошта той праём патрэбны, я ўжо не цікавіўся, бо ж няхай і ягоны першапраходца захавае нейкі свой сакрэт. А сакрэт той падаецца мне вельмі інтрыгуючым, бо ж праз тую агароджу, заміж яе балюча раніць, можна было папросту пераскочыць і мо стаць прызёрам нейкай сусветнага маштабу міратворнай прэміі. Калі б там, вядома, адбываліся нейкія светаўскалыхальныя падзеі...

У Гайнаўцы, асабліва навокал шпітальнай агароджы, аднак, такіх падзей яшчэ не было; так мне прынамсі здаецца. А маглі б адбыцца, і хто ведае, ці яшчэ не адбудуцца. У чым жа аснова такога майго меркавання? А ў тым, што тая агароджа пралягае па тэрыторыі самой Пушчы. Калі б у час будовы гайнаўскага шпіталя была ў нашым грамадстве такая экалагічная свядомасць, якую маем зараз, вельмі сумняваюся, ці тую агароджу ўдалося б паставіць, а мо нават не ўдалося б пабудаваць і самога шпіталя. Напэўна знайшліся б такія вартавыя акружаючага наваколля, якія даказалі б, што ў прадбачаным на агароджу месцы жывуць нейкія жывёльныя і раслінныя эндэмікі, якіх у ніякім выпадку нельга трывожыць. І паставілі б там палаткі, і прывязаліся б да дрэў ланцугамі, і голасныя галадоўкі аб'явілі б...

Мне падазраваецца больш. Менавіта мяркую я, што эндэмічныя мікраарганізмы могуць пражываць не толькі ў пушчанскай глебе ці ляжачых на ёй спарахнелых альбо прагнілых рэштках іншых пушчанскіх арганізмаў. А ці ж можна мець упэўненасць, што ў арганізмах насельнікаў пушчанскіх мясцовасцей няма таксама нейкіх характэрных адно ім эндэмікаў, якіх знікненне магло б сур'ёзна пагражаць сусветнай экасферы? Я, прынамсі я, такой упэўненасці не маю. Я амаль поўнасцю перакананы, што наш пушчанскі народ носіць у сваіх вантробах унікальныя ў планетным маштабе мікраарганізмы, якія таксама трэба ахапіць неадкладнай аховай.

Як жа ж ахоўваць тыя вантробныя арганізмы — спытае хто. Справа здаецца мне нескладанай — трэба законна забараніць іх знішчэнне. Значыць, адпаведныя органы, а ў гэтым выпадку, калі кранаем спраў сусветнага маштабу, найбольш адпаведнымі былі б найважнейшыя дзяржорганы — бо ж гэта справа — паўтару — не абы-якога рангу, павінны прыняць законы, забараняючыя ўводзіць у мясцовыя вантробы шкодныя іхнім эндэмікам рэчывы, прасцей кажучы — супрацьмікраарганічныя хімікаты, а яшчэ прасцей кажучы — фармакахімікаты, а яшчэ больш прасцей — аптэчныя лякарствы.

Можа хто абурыцца, што гэта негуманнае. А ці гуманным можна назваць увод у арганізм тых жа фармакахімікатаў, якія памылкова прынята называць лякарствамі, калі добра вядома, што яны выклікаюць пабочнае шкоднае ўздзеянне на здароўе? Калі прыглянуцца найбольш навязлівым іх рэкламам, дык відаць там з несумненнай несумненнасцю, што тыя ўсе лякарствы пагражаюць не толькі здароўю, але нават жыццю. І найбольш бяспечнымі падаюцца тады спрадвечныя, не турбуючыя прыроды замовы; прыродаварожае вырыванне лекавых зёлак з іхняга біяцэнозу лічу непрымальным. Калі турбавацца за прыроду, калі турбавацца за здаровага чалавека, трэба вылавіць з водаваротаў Леты эндэмічных, трымаючыхся яшчэ на яе плаву нямногалікіх замовазнаўцаў — шаптух. І развесці іх, як у міжваенны час развялі пушчанскіх зуброў. І ахоўваць іх. І вынесці іх не толькі ў амбулаторыі ці шпіталі, але і на кафедры мясцовых медуніверсітэтаў.

У гэтай справе ёсць ужо і нізавы зрух, без чакання на Сейм ці Сенат. Менавіта, як падаюць гайнаўскія чуткі, група тамашніх медыцынскіх ударнікаў заініцыявала вяртанне ў эпоху шаптух і чараў, уводзячы ў набор сваіх медыцынскіх прыёмаў экзарцызмы. Толькі тыя экзарцызмы, хаця ў сваёй глыбокай сутнасці адмаўляюцца ад фармакахімікатаў, а на від не адмаўляюцца — з больш сучаснай эпохі — у іх наш дух часу. А зводзяцца яны да адгону ад нямоглых не ўстарэлых нячыстых сіл, але турботных і вельмі шкодных нямоглым цывілізацыйных выдумак у выглядзе нацбанкаўскіх купюр — адгону ў свае бяспечныя бесхімікатныя фонды. Праўда, гэтая курацыйная навінка яшчэ не асэнсавана навукова адсталымі работнікамі супрацьподкупнага агенцтва, якія намагаюцца ўсадзіць кій у спіцы гайнаўскім экалагічным стаханаўцам.

У гэтым месцы вярнуся я да справы, якую я незаўважна пакінуў пару радкоў таму назад — да аптэк. Лічу, што гэтым установам, якія адкрыта ўводзяць шкодныя мясцовай прыродзе рэчывы, трэба заявіць рашучае НЕ. НЕ для іх далейшай дзейнасці, якой радыус закранаў бы ахоўную зону нашай Пушчы, якую я далей буду называць папросту Пушчай. Калі ім, усё ж такі, вельмі хочацца далей дзейнічаць, няхай тады выбіраюцца ад Пушчы ТУДЫ. ТУДЫ ім, нават да крылатафразнай Фені.

А ў гэтым месцы можа хто жахнуцца — а як жа ж жыць людзям, якім аптэкі сталі ўжо прадуктовымі крамамі? Якія без тых фармакахімікатаў не могуць абысціся, так як сучасныя палі не могуць жыць без аграхімікатаў? Не тое, што вярблюды без вады. У гэтай сітуацыі неабходная дысцыплінаваная мабільнасць амаль немабільнага ў даэкалагічную эпоху насельніцтва. Следам за аптэкамі. З клункамі лякарстваў. Бо тыя, што без лякарстваў, ужо раз'ехаліся па свеце. А ж варта прыгадаць, што ў гэтага нашага насельніцтва слаўныя мабільныя традыцыі — неўзабаве ж будзем адзначаць стогадовы юбілей вялікага мабільніцкага тутэйшага парыву. Можа ўжо што пад гэты юбілейчык? Дзеля захавання гэтых мясцовых традыцый...

Стой-пастой — можа хто аспрэчыць мой праект. А чым жа ж будзе запоўніць дэфармакахімікаваную і дэдэмасаваную прастору? Пустою астанецца? У ніякім выпадку! Прастора ж будзе неабходная для пашырання Пушчы. Бо растуць новыя пакаленні эколагаў з узбуйненай экалагічнай свядомасцю, якія, так як і дасюлешнія пакаленні, таксама захочуць пашыраць Пушчу. І растуць іх ужо мільёны, ці можа нават мільярды; у самім Кітаі колькі эколагаў і неэколагаў! І кожны з іх захоча пашыраць Пушчу. Да Старога Корніна, Старога Беразова і Старога Ляўкова. Да Новага Корніна, Новага Беразова і Новага Ляўкова. Да Крынак і Гарадка. Да Сейнаў і Пунска. Да Лысых і Мышынца. Да Картузаў і Пуцка. Да Паліц і без граніц. І кожны з мільёнаў-мільярдаў іх мае на гэта эгалітарнае законнае права. І кожнаму трэба даць паводле патрэбнасцей. Штогоду, штомесячна. Кожны дзень, на снеданне, абед, вячэру. Бо ж магчыма, што яны могуць не выжыць без пашырання Пушчы. Як эндэмікі. Тыя мільёны ці мільярды. Не тое, што вярблюды без вады.

А тыя мільёны, ці можа нават мільярды — гэта ж электарат, за якім у сваёй глыбокай сутнасці, а на від перад якім — выбягуць ахвотныя ў абраннікі таго ж электарату, якія таксама запатрабуюць пашырання Пушчы. І так ззадусперада тых народных мас іскрыцца будуць дэпутаты і сенатары, міністры і віцэ-міністры, маршалы і маршалкі, першастаяцелі і першасядацелі, візіры і эміры, рыцары і баяры. І Бацька наш карпатлівы, і ягоныя таварышы, кампаньёны, камарады, куміры з Азіі і Афрыкі, з Блізкага і Далёкага — Усходу і Захаду. І ўсе яны будуць іскрыцца перад сваімі электаратамі за пашыранне нашай Пушчы. І ўсім ім таксама трэба будзе паводле патрэбнасцей.

А нам тутэйшым — выйсці шчыльнымі радамі — мужыкам — у агромністай такой грамадзе — статыстамі дэпутатам і сенатарам, міністрам і віцэ-міністрам, маршалам і маршалкам, першастаяцелям і першасядацелям, візірам і эмірам, рыцарам і баярам, таварышам і кумірам — паводле патрэбнасцей — дэпутатаў і электаратаў, і гэтак далей.

Дзве прэзентацыі беларускай культуры ў Гданьску



Фота СЦЯПАН СВІДЗЕРСКІ

Лена ГЛАГОЎСКАЯ

На апошнім тыдні ў Гданьску незалежна ад сябе прэзентавалася беларуская культура. У чацвер, 24 лютага, у Цэнтры сучаснага мастацтва „Лазьня" адбыўся паказ беларускага відэамастацтва. Куратаркай прэзентацыі была Вольга Маслоўская, мастачка-перфомерка з Брэста, якая з Раманам Трацюком ствараюць групу „Бергамот" (існуе з 1998 г.). Відэамастацтва дазваляе на мультымедыйную прэзентацыю. Не патрабуе яно выставачных залаў, толькі адпаведную тэхніку і экран. Аглядаючы асаблівыя мастацкія творы, маеш уяўленне, што ты ў кіно, а не ў галерэі. Адно, што тое, што глядзіш, пачынае дзейнічаць на ўражлівасць чалавека, так як дзейнічае мастацтва. Праўда, адчуванне вокамгненнае, якое аднак сваім уздзеяннем затрымліваецца ў галаве надаўжэй. Астаецца недахоп перажывання. Нельга вярнуцца да карціны і яшчэ раз у яе ўглыбіцца. І так засела ў маёй галаве праца Аляксандра Камарова „Празрыстасць" — гульня шклом як фонам, прасторай ды своеасаблівай мяжой, праз якую можна пабачыць свет па абодва бакі шклянога будынка нямецкага бундэстага, які стаў творчай інспірацыяй для мастака.

Вольга Маслоўская прадставіла нялёгкую сітуацыю сучаснага беларускага мастацтва, асабліва яго авангардных форм, такіх як перформенс ці відэамастацтва. Прадставіла яна творчасць тых мастакоў, якія зараз з поспехам творыць у Еўропе і прэзентуюць сваё мастацтва ў Нямеччыне, Галандыі, у Польшчы: Максіма Тымінкі, Глеба Шутава, Аляксандра Камарова, Ягора Галузы, Андрэя Логінава. Ад сустрэчы атрымалася ўражанне, што, нягледзячы на ўсякія складанасці, беларускія мастакі ўмеюць пакарыстацца найнавейшымі тэхналогіямі ў службе мастацтву. Астаецца толькі пытанне: што з гэтай творчасці застанецца нашчадкам? А пакуль мастацтва жывое, варта яго паказаць таксама ў Беластоку, бо — апрача Гданьска — можна было яго пабачыць у Варшаве і ў Познані, дзе Раман Трацюк працуе асістэнтам на кафедры інтэрмедыяў Акадэміі мастацтваў.

У пятніцу, 26 лютага, у літаратурнай кавярні „Фікцыя" ў Гданьску-Вжэшчу (на здымках) адбылася прэзентацыя творчасці Уладзіміра Някляева „Літаратура контра дыктатура", якую падрыхтавалі Беларускае культурнае таварыства „Хатка" і навуковае кола „Мазаіка" пры Гданьскім універсітэце. Ініцыятаркай сустрэчы была студэнтка культуралогіі Надзея Вярбоўская. Падрыхтавала яна мультымедыйную прэзентацыю пра паэта. Затым Франак Вячорка, Надзея Вярбоўская, Аліна Крутэль, Анна Катовіч і Мацей Годэк чыталі творы Уладзіміра Някляева ў арыгінале і ў перакладзе на польскую мову. Асобу паэта, яго жыццёвы і творчы шлях прадставіла Лена Глагоўская. Паколькі паэт быў адным з кандыдатаў на пасаду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і быў збіты і затрыманы 19 снежня і зараз знаходзіцца пад хатнім арыштам, размова звялася да палітычнай сітуацыі ў Беларусі, стану беларускай мовы ў ёй ды сітуацыі творцаў. Удзельнікі сустрэчы пісалі лісты падтрымкі Уладзіміру Някляеву.

Пішучы пра два мерапрыемствы на апошнім тыдні лютага ў Гданьску, варта адзначыць шматлікую прысутнасць на іх маладых людзей, якія зацікавіліся з'явамі ў сучаснай беларускай культуры, загубленымі сярод палітычных падзей у Беларусі.

Салідарнасьць http://salidarnasc.org

Стан беларускага грамадства ў пасляпрэзідэнцкіх перыяд некаторыя палітолагі ацэньваюць як халодную грамадзянскую вайну. Рэй вядзе, зразумела, улада, на баку якой чыноўніцкі апарат, войска, сілавыя структуры і цэлы дзяржаўны бюджэт. Тыя, хто прагне жыць у дэмакратычнай Беларусі, не маюць практычна нічога, акрамя жадання, але гэтае жаданне рухае імі і не дае спакойна спаць ані ўласна ім, ані ўладзе. І для таго, каб неяк трымацца і не быць цалкам зламанымі ім больш за ўсё патрэбна адчуваць салідарнасць, усведамляць, што яны не самотныя ў сваіх памкненнях.

Для таго, каб пачуццё салідарнасці не знікала, у беларускім сеціве існуе сайт, які так і называецца „Салідарнасць" і месціцца па адрасе **http://salidarnasc.org**. Выгляд сайта даволі просценькі. Там няма зашмат старонак, вялікіх аздабленняў, мультымедыйных опцый. Затое сайт выконвае сваю асноўную функцыю — інфармаванне палітычна актыўных людзей як трэба сябе паводзіць у тых ці іншых варунках, якія могуць скласціся ў іх жыцці.

Першая старонка „Салідарнасці" змяшчае эмблему Камітэта абароны рэпрэсаваных і некалькі выйсцяў да рубрык. Для большага знаёмства з камітэтам варта зазірнуць на старонку „Пра нас". „Камітэт абароны рэпрэсаваных «Салідарнасьць» быў скліканы адразу ж пасьля вясновых падзеяў 2006 года. У сакавіку беларусы даказалі, што яны хочуць бачыць Беларусь дэмакратычнай эўрапейскай дзяржавай і гатовыя дзеля гэтага ахвяраваць асабістым дабрабытам, свабодай, нават жыццём. Рэжым зрэагаваў на мірны пратэст людзей супраць фальсыфікацыі прэзыдэнцкіх выбараў хваляй рэпрэсіяў. Столькі рэпрэсаваных за адзін тыдзень — больш за 1000 чалавек — нашая краіна ў сваёй сучаснай гісторыі яшчэ ня бачыла!". Як бачым, у 2010 годзе гісторыя амаль паўтарылася, з той толькі акалічнасцю, што цяпер рэпрэсуюць ужо не толькі на суткі, але і на гады.

Галоўнай сваёй задачай Камітэт абароны рэпрэсаваных „Салідарнасьць" бачыць у разбурэнні страху ў беларускім грамадстве. „Сёньняшняя ўлада спрабуе пры дапамозе ціску, запалохваньняў і рэпрэсіяў пазбавіць нас вольнай думкі, зрабіць з нас маўклівых рабоў. Але немагчыма вынішчыць у чалавека жаданьне Свабоды і пачуцьцё асабістай годнасьці!" — кажуць „салідарнікі".

Пра тое, чым непасрэдна Камітэт абароны можа дапамагчы тым, хто трапіў пад палітычны пераслед з боку лукашэнкаўскіх улад, мы можам даведацца, зазірнуўшы ў рубрыку „Дапамога". Праўда, некаторыя падрубрыкі там нядзейныя альбо інфармацыя ў іх састарэлая і не зусім адпавядае рэчаіснасці. У той жа час некаторыя звесткі будуць карысныя. Напрыклад, як паводзіць сябе, калі з вамі спрабуюць сустрэцца супрацоўнікі спецслужбаў, пра правы падчас адбывання адміністрацыйнага арышту, альбо пра правы жанчын у сістэме правоў чалавека.

На сайце ёсць некаторыя старонкі, сэнс існавання якіх застаецца не зусім зразумелым. Гэта тычыцца як тых, што яшчэ ў распрацоўцы і невядома, якім зместам іх напоўняць уладальнікі сайта, так і існуючыя, якія чамусьці не змяшчаюць інфармацыі, згодна сваёй назве. Гэта тычыцца перш за ўсё „Рэпрэсій". Падаецца, Камітэту абароны рэпрэсаваных варта больш дбайна ставіцца да свайго твару ў інтэрнэце.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

С БЕЛАРУСІ ы

Возера Свіцязь

Унікальнае прыроднае возера з'явілася на Наваградскай зямлі ў глыбокай старажытнасці — каля дзесяці тысяч гадоў таму. Можна сказаць, што гэты вадаём невялічкі — ягоная плошча не перавышае 2,2 квадратнага кіламетра, а сярэдняя глыбіня сягае тры з паловай метра. Свіцязь — славутае сваёй легендай, надзвычай таленавіта ўвасобленай у творчасці найперш Адама Міцкевіча. Нездарма гэтае возера называюць сэрцам Наваградчыны. У старажытным паданні пра горад, які пайшоў разам з жыхарамі на дно, каб не дастацца ворагам-заваёўнікам, верагодна пераплецены сапраўдныя гістарычныя падзеі з багатай народнай фантазіяй, рэальнае змаганне з даўнімі ўяўленнямі пра годнасць і гонар. Ці існаваў нібыта міфічны горад Свіцязь? Прынамсі, мясцовыя краязнаўцы раней ведалі таямнічую каменную дарогу, якая вяла па дне возера. Пра гэта, напрыклад, пісаў вядомы прыродазнавец дзявятнаццатага стагоддзя Бенядыкт Дыбоўскі, які прыкладаў нават адмысловую мапу. Ужо сучасная адмысловая экспедыцыя не так даўно таксама выявіла рэшткі гэтай загадкавай брукаванкі. Адна з гіпотэз даводзіць, што некалі пасярод возера было паганскае, магчыма яшчэ даславянскае, капішча. У кожным разе дзівоснае возера Свіцязь пакуль захоўвае свае таямніцы.

Мала дзе ў Беларусі можна знайсці ваду такой празрыстасці, у якой выразна відаць кожны каменьчык і такога жаўтаватага адцення, такога адбітку, які дае лагодны, неверагодна мяккі пад нагамі жвірок. Нідзе напэўна не ўбачыш і такіх схіленых да азёрнага люстэрка дрэў, ужо амаль карчоў і зусім яшчэ жывых, якія нібы самі імкнуцца да чароўнай вады, такога атачэння і „аховы" асілкаў-дубоў. Таму фотаздымкі, зробленыя ў гэтай мясціне, лёгка пазнаюцца тымі, хто хоць раз тут пабываў. На Свіцязі кожны шукае і адкрывае для сябе нешта сваё — хто вабныя краявіды, хто сакральнае Месца сілы, хто міфічную свіцязянку, а хто і сучасных наваградскіх німфаў.

Пра каштоўнасць Свіцязі сведчыць той факт, што тут растуць такія рэлікты як „чырвонакніжныя" лабелія Дортмана (дарэчы, моцны алкалоід), палушнік азёрны. Тут можна выявіць тэтрадыніум яванікум. Апошняя назва яскрава паказвае, што паходзіць гэтая расліна зусім з іншых шырот — з вострава Ява. Як яна трапіла сюды ў нетры Наваградскай зямлі і вады з далёкай Інданезіі — таксама вялікая загадка.

Бясспрэчна, што Свіцязь робіць чалавека хоць крыху лепшым. Гэтае таямнічае возера міжволі і неўпрыкмет змушае задумацца над сэнсам нашага існавання, над хараством створанай Богам прыроды, над тым, што ўсё некалі сыходзіць на дно і адраджаецца ўжо ў іншым абліччы. Свіцязь — гэта не проста вадаём, Свіцязь — гэта рэінкарнацыя, гэта сувязь з іншым светам, гэта найвышэйшая прыродная эстэтыка і пошук душэўнай гармоніі.

Апошнім часам улетку да возера не прабіцца, каб пабыць у самоце, трэба ўвогуле прыязджаць у іншую пару года. Навукоўцы пачынаюць біць сапраўдную трывогу, бо людская неахайнасць, хамства і няўдзячнасць пагражаюць дзівоснаму прыроднаму стварэнню сур'ёзнай экалагічнай катастрофай. Свіцязянскі ландшафтны заказнік пад пагрозай занядбання і патрэбнае ўжо дзяржаўнае ўмяшанне, каб захаваць яго для нашчадкаў. Каб зноў, прыехаўшы сюды дзвесце гадоў пасля вялікага паэта, кожнаму з новага пакалення „між дрэў, бы ў вяночку, адкрыецца воку там возера Свіцязь, як дзіва...".

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Меланж шматкультурнасці

Ігнат Карповіч (злева) і Ян Леанчук

Дарыюш Кялчэўскі з творам „Opowieści z Chruściela", Міхал Андрасюк са зборнікам „Wagon drugiej klasy, Ігнат Карповіч з раманам „Balladyny i romanse" і Ян Леанчук са зборнікам лірыкі „Zadziwienia" (у намінацыі таксама за сукупнасць творчасці) былі намінаваны да літаратурнай узнагароды імя Веслава Казанэцкага — узнагароды прэзідэнта горада Беластока з 19 заяўленых капітулу кніг. Гэтая ўзнагарода назначаецца аўтарам, якія звязаны з літаратурным асяроддзем Беластока або тут нарадзіліся ці пражываюць, або іх творчасць паказвае сувязі з горадам і рэгіёнам ды аўтарам, кнігі якіх выдадзены ў Беластоку. Узнагарода прызначаецца без падзелу на жанры; выключаны з удзелу анталогіі і апрацоўкі. Патрон узнагароды, памерлы ў 1989 г. паэт, празаік і публіцыст, быў родам з Беластока. Як сказаў старшыня капітула ўзнагароды Марэк Каханоўскі, кожная з гэтых публікацый на свой спосаб адметная і моцна звязаная з нашым рэгіёнам, кожная з іх прадстаўляе каштоўнасць самую ў сабе, характэрную для свайго жанру, — гэта найбольш адметныя творчыя і свежыя прапановы.

„Wagon drugiej klasy" Міхала Андрасюка (1959, Гайнаўка) з'яўляецца чацвёртым томам прозы і адначасна дэбютам у рамане і першай яго кнігай напісанай па-польску. Гэта аповед аб асобе, пражываючай у прасторы часу. Кніга засяроджваецца на Гайнаўцы, але мае ўніверсальны маштаб: гаворыць пра любоў, памкненні і чалавечыя мары. „Opowieści z Chruściela" Дарыюша Кялчэўскага (1967, Астралэнка) гэта 17 кароткіх апавяданняў аб жыхарах забытай недзе на Падляшшы вёскі, напісаных характэрнай мовай, поўныя гумару і нярэдка гратэскных персон. Кніжка паказвае рэаліі жыцця ў вёсцы ў час ПНР. Некаторыя гісторыі публікаваліся ў беластоцкім літаратурным часопісе „Карткі" (аўтар падпісваў іх псеўданімам „Дзвонка Хрушчук"). „Balladyny i romanse" Ігната Карповіча (1976, Случанка) — яго пяты раман — гэта кніга аб ідэях, якія матэрыялізуюцца. Багі адмаўляюцца ад сваіх сядзіб, пачынаюць жыць на зямлі, уплываючы на жыццё людзей (у Варшаве, у Беластоку...). Іранічная і вельмі інтрыгуючая кніга гаворыць аб кандыцыі сучаснага чалавека, адносінах з іншымі і акаляючай яго рэчаіснасці. У абгрунтаванні рашэння аб узнагародзе было напісана, што кніга „Balladyny i romanse" (выдадзеная кракаўскім Літаратурным выдавецтвам) гэта проза, „якой не пасаромелася б ніякая нацыянальная літаратура сучаснай Еўропы" (кніга сёлета здабыла таксама Пашпарт „Палітыкі"). Аб ёй сказаў старшыня капітула, што да сёння не было ў Беластоку твора, „які ў такі шырокі спосаб, такі крайні, так жахліва шчыры, каменціраваў бы сустрэчу чалавека з карцінкавай цывілізацыяй, з рэлігійнай тоеснасцю, міфам ці шырока разуметай мадэрнасцю". „Zadziwienia" Яна Леанчука (1950, Лубнікі) гэта зборнік вершаў аднаго з найбольш папулярных беластоцкіх паэтаў. Ян Леанчук з'яўляецца дырэктарам Падляшскай ксёнжніцы. У абгрунтаванні напісана, што паэзія Леанчука „вызначае нашу тоеснасць" ды „выклікае свет адыходзячых каштоўнасцей". Каханоўскі сказаў, што „Zadziwienia" Леанчука гэта найлепшы зборнік лірыкі гэтага паэта і „тлумачыць ён свет".

Узнагароду імя В. Казанэцкага Ян Леанчук і Ігнат Карповіч да гэтага часу атрымлівалі двойчы. Абодва яны атрымалі літаратурную ўзнагароду прэзідэнта Беластока трэці раз. Уручана была ім (12 тыс. зл. Карповічу і 20 тыс. зл. Леанчуку) на ўрачыстасці ў Цэнтры Заменгофа ў Беластоку ў пятніцу 3 сакавіка вечарам. Папярэдзіла ўрачыстасць выступленне стыпендыяткі прэзідэнта горада Ілоны Карпюк-Дамброўскай з фрэндамі — як адзначылі вядучыя, дзеля падкрэслення шматкультурнасці, якой хапала таксама ў вылучаных кнігах. Узнагароды абмеркаваны і прызнаны былі капітулам аднагалосна, прымяркоўваючы аўтараў і іх творы а то да Грабаля ці Маркеса (Андрасюк), а то да Рэдлінскага (Кялчэўскі). Ужо зараз паявіўся аднак разнабой на форумах у інтэрнэце сярод чытачоў. Звярнулі яны ўвагу на тое, што выдадзеная ў элітарным агульнакраёвым выдавецтве кніга б'е накаўтам кніжку Андрасюка — пра якую шэф капітула дакінуў яшчэ слоўца „urocza" быццам гэта была нейкая катэгорыя (выдадзеную Цэнтрам грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь) ці Кялчэўскага (Фонд „Суседзі"). Хоць і сапраўды — чытаючы кнігу „Balladyny i romanse", таўшчэрны гожы том, які не праглынеш за адным прысестам, чуецца „рэдкі гук ападаючай сківіцы" ад уражання ад усіх боска-людскіх перыпетый і мастацтва аўтара. Ігната Карповіча, празаіка, перакладчыка з ангельскай, іспанскай і амхарскай моў, падарожніка, аўтара „Niehalo" (Czarne, 2006), „Cud" (Czarne, 2007), „Nowy Kwiat Cesarza (Państwowy Instytut Wydawniczy, 2007), „Gesty" (Wydawnictwo Literackie, 2008) і „Balladyny i romanse" (Wydawnictwo Literackie, 2010) нават параўнаць няма з кім і няма як раскласці па паліцах.

— Падзякі гэта не той літаратурны жанр, у якім сябе добра адчуваю, таму перайду да сутнасці і скажу проста „дзякуй"! — жартаваў Інат Капровіч з-за аграмадных букетаў ад гарадской беластоцкай улады.

13.03 — 19.03

(22.03. — 20.04.) Уступяць у цябе новыя сілы. Паправіцца настрой, адхрысцішся ад вірусаў. Ажывуць старыя знаёмствы. Будуць ацэнены твае стараннe, самастойнасць, працавітасць. З 17.03. (да 21.03.) магчымыя спрэчкі і непаразуменні.

(21.04. — 21.05.) Варта пайсці новымі шляхамі і пашырыць гарызонты. 13-17.03. паправяцца твае стасункі. Паявяцца нагоды наладжання карыснага і доўгага супрацоўніцтва. Будзеш шчодры і нікому не адмовіш дапамогі. Інтэнсіўна варушыся.

(22.05. — 22.06.) Мілыя сустрэчы з сябрамі. Не бойся нестандартных рашэнняў; калі не выкарыстоўваеш сваіх магчымасцей на працы, пашукай іншай або адкрый свой бізнес. Да 15.03. будзеш няўступчывы і хітры, а 16-20.03. — кідацца паміж эйфарыяй і сумненнямі.

(23.06. — 23.07.) З 12.03. будзеш схільны да неабачлівых рашэнняў; некаторыя змены акажуцца быць надта радыкальнымі. Не пераймайся — сябры, якія адыдуць, мабыць — фальшывыя. Мала часу на інтэнсіўнае кампанейскае жыццё, хіба што з сябрамі падасіся ў падарожжа. Лячыся мёдам і часнаком.

(24.07. — 23.08.) Будзеш гнацца за грашыма і прыемнасцямі. Не прапусціш ніякай нагоды зарабіць, знюхаеш залаты інтарэс. З 18.03. (да 22.03.) цяжка будзе адмовіцца ад спакус. Мноства аматараў (найбольш з падазронай рэпутацыяй!). Свабодныя Львы маюць нагоду пазнаёміцца з кімсьці вельмі цікавым. Магчымая ўзнагарода ад кіраўніцтва (неабавязкова грошы).

(24.08. — 23.09.) Асаблівае шчасце! — можаш штосьці выйграць, атрымаць падарунак ці спадчыну. Нават невялікая рызыка прынясе дастатковыя прыбыткі. Калі заробіш, не бойся расходаваць (шчасце ў фінансах будзе з табою не коратка!). Смела можаш змяняць свой выгляд. 16-20.03. можаш адчуць паслядоўнасці мінулых памылак (калі гэта былі нятрапныя інвестыцыі, прыйдзецца зрабіць новую дзірачку ў папрузе).

(24.09. — 23.10.) Вельмі ўдалыя канфігурацыі зорак! Усё, што вырашыш, зрэалізуеш на 100%. Не будзе для цябе немагчымага! 13-17.03. — стабільнасць, пачуццё бяспекі і парадку. Хоць да 15.03. асцерагайся падазроных інтарэсаў і людзей; глядзі на рукі супрацоўнікам. 19.03. (поўня Месяца) — крыху нерваў; можа рассакрэціцца падман.

(24.10. — 22.11.) Парабі як найбольш з таго, што маеш да работы; слухай парад і асцярог. Цяжка будзе запанаваць над нервамі (19.03.). Да 15.03. магчымыя канфлікты на працы; не бяры пазык. Народжаныя на пераломе кастрычніка і лістапада могуць пазбыцца благіх звычак.

(23.11. — 22.12.) 14-18.03. будзеш мець дасканалыя задумы, не падвядзе цябе нос у ацэнцы сітуацыі, шчасце да людзей. 19.03. будзеш лішне шчодры або празмерна хцівы; пільнуй выдаткаў, бо страціш над імі кантроль. Стральцы народжаныя пасля 20.12. няхай нічым не пераймаюцца (змена планаў можа павесці ў добры бок). У фінансах знойдзеш неспадзявана добрую крыніцу прыбыткаў!

(23.12. — 20.01.) Адкрыюцца перад табою новыя магчымасці. Можаш вярнуцца ў гульню. 16-20.03. будзе цябе турбаваць думка, што ніхто з табою не лічыцца, бо думае пра сябе і свае інтарэсы. Ды 13-17.03. будзеш мець вялікае шчасце ў каханні і фінансах!

(21.01. — 19.02.) Перад табою сапраўды шчаслівыя дні — адважна здзяйсняй свае мары — яны сапраўды рэальныя! Выкарыстоўвай шанцы. 19.03. могуць турбаваць цябе ў сям'і, наракаць на тваю абыякавасць. 16-20.03. магчымыя праблемы ў пары; партнёр нечакана адмовіцца ад абяцанняў, могуць не ўдацца вашы планы.

(20.02. — 21.03.) Дзейнічай спакойна, не выходзь перад шарэнгу. Рабі сваё і не азірайся на іншых. Пачні ашчаджаць, зрабі спісак найважнейшых выдаткаў (не бойся, не будзеш жыць адно хлебам і вадою!). З 17.03. (да 21.03.) не разлічвай на мірнае афарамленне спрэчак.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Адгаданка

1. супрацьлеглая лету, 2. мастацкае праектаванне эстэтычнага выгляду прамысловых вырабаў, 3. Буда-Пешт у Венгрыі, а на Гомельшчыне Буда-..., 4. пакуль ён не грымне, мужык не перахрысціцца, 5. галоўны старажытнарымскі бог, які даў назву найбольшай з сонечных планет, 6. грашовае выражэнне вартасці тавару, 7. нутраное свіное сала, 8. 16,38 кілаграма, 9. 2,54 сантыметра, 10. густая мучная або крупяная каша з салам, 11. раптоўны набег, напад, мнагалюдны прыезд, 12. прозвішча аўтара „Альпійскай балады", 13. фундаментальная дыля, падваліна.

1		2				3					4	
									5			
		6										
		7			8				9			
	10					11		12			13	

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — прыказка. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 6 нумара

Аднадумства, боль, буян, вакуум, гравій, ежа, Зюзя, Іўе, лёд, мумія, пакойнік, ртуць, Сож, сцяна, турма, хімія, Цхінвалі, штраўс, яма, яхта.

Рашэнне: **Я толькі ведаю: я раб бязмежнага узлёту дум сваіх, што святасцяй пакорніцкай лятуць у мір маіх сумніваў, у мір маіх жаданняў.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк, Янка Целушэцкі.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej
— 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 300 egz.

— А цяпер прыложымся да іконы Пачаеўскай Божай Маці і пойдзем, усе як тут стаім, у клуб на спектакль! — загадаў айцец Яўгеній. Яшчэ да таго ён патлумачыў сваім парафіянам: ікон у нас не цалуюць; цалаваць можа хлапец дзяўчыну, а да іконы трэба падысці і прылажыцца. У час, калі хары ўжо блаславілі *власти и воинство ея и всех православных християн*, бацюшка ўсё паўтараў:

— Усе, як тут мы стаім, давайце пойдзем у святліцу. Мы павінны належным чынам ацаніць тое, што ёсць яшчэ людзі, якія хочуць да нас прыязджаць з беларускай культурай, спяваць песні...

Ніхто, уключна з бацюшкам, не спадзяваўся, што спектакль «Ой даўно, даўно» так моцна кране за душу, разбудзіць успаміны, выціснe слёзы...

* * *

— Нам вельмі залежала, каб выступіць у вёсках, адкуль нашы гісторыі, — кажа Аліна Ваўранюк, рэжысёр і апякун групы. — Мы былі цікавы як людзі адрэагуюць хоць бы на расказ пра Галену Пасяленцаву. І людзі смяяліся ў гэты момант. Бо нам не ідзе, каб *раздзіраць свае раны!* Не, мы паказваем што ў жыцці побач бяды і гора была таксама радасць, былі жарты і песні.

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

У ПАСЫНКАХ РАЗБУДЗІЛІ ЎСПАМІНЫ!

Пасынкі — асаблівая кропка на карце турнэ. Адсюль родам Ніна Кучынская, бабуля Лідкі Пякарскай. У спектаклі ажываюць яе ваенныя ўспаміны пра пажары і страляніну, вывазку на прымусовыя работы...

Пастаноўка ў Пасынках (28 лютага г.г.) атрымалася найлепш з тых трох, якія я бачыла. Публіка, у асноўным старэйшыя людзі, проста ажылі. Многія ўціралі слёзы, часам смяяліся або цяжка ўздыхалі.

— Я сядзеў і плакаў цэлы час, — кажа бацюшка Яўгеній Сушч. — Гэтыя расказы я памятаю ад дзеда і бабы. Мая бабуля была вывезена ў Расію. Пасля яна да канца жыцця сушыла хлеб і хавала яго ў мяшку пад печкай. І гаварыла нам: *Дзеткі, памятайце, каб заўсёды ў вас былі падрыхтаваны на чорную гадзіну сухары, запалкі і нафта.* Добра памятаю тыя мяшкі з сухарамі і бабулю, якая ведала што такое голад.

— То так як цэлае жыццё прыгадалася, — кажа Ніна Сцепанюк з Пасынак. — Тое, пра што гаварылі, было ў кожнай вёсцы. І ў Пасынках, і ў Кленіках, і Чыжах... Гэта наша *судзьба*, лёс. Толькі той песні «Ой чыя то хата стоіт пры доліні» ў нас так не расцягвалі як вы.

Ніна Сцепанюк — вядучы жаночы голас у пасынкаўскім царкоўным хоры.

* * *

Жахлівыя вобразы і ўспаміны з мінулага, якія з-за чалавечай слабасці хаваем пад сукно, усё роўна адзываюцца з неба:

— Мы часта ў сям'і ўспамінаем пра гэтую жыдоўку, пра якую вы гаварылі ў спектаклі, — кажа Янка Зенюк, асветны і праваслаўны дзеяч родам з Рэпіск. Разам з жонкай гасцяваў ён у Агароднікаў і наведаў царкву. — Я добра іх памятаю, памятаю як мы перажывалі іх знікненне. Вельмі дзякую, што сёння вы прыпомнілі іх. Аб гэтым нельга забывацца каб тыя страшныя дні не паўтарыліся.

— А я вам дзякую, што вяртаецеся да нашых каранёў, і што дзякуючы вам наша мова жыве, яна не адкінута і не забыта, — дадаў айцец Яўгеній.

— Сёння ў час літургіі вы гаварылі пропаведь па-свойму. А ці часта карыстаецеся роднай мовай у царкве? — спыталі мы айца.

— Я рускай мовы не ведаю настолькі дасканала, каб гаварыць на ёй пропаведзі. Не без значэння і адзін выпадак. Калісь, як я быў на Грабарцы, адзін наш бацюшка пачаў гаварыць пропаведзі па-расейску. Разам са мной стаялі людзі з Расіі, то тыя расіяне не ведалі як сябе павесці. Бачу, адзін ужо схапіўся за галаву! Бо тая нашая мова, так сказаць, для іх гучала далёка не літаратурнай, а *wręcz i przeciwnie.* Я сам не хачу калечыць рускай мовы, таму гавару як мяне дзяды і бацькі навучылі: па-свойму.

* * *

У Пасынскай парафіі пражывае 560 душ, з таго 80 маладых. Яны разам з настаяцелем арганізуюць паломніцтвы і вясковыя запусты, навагоднія балі. Сёння падрыхтавалі для гасцей застолле і незабыўны, сардэчны прыём.

— А ці вам, маладому чалавеку, «Падляшскія хронікі» падаліся «сваімі»? — пытаю ў ангажаванага ў жыццё царквы хлапца родам з Піліпак:

— Я не такі малады, — агаворваецца Мікалай Філіпюк, — мне ўжо сорак шэсць гадоў. Ведаю гэтыя ўсе гісторыі. Я хадзіў з татам і мамай яшчэ на вячоркі. Там людзі адно пра такія рэчы гаварылі. Пасля, калі я вёў краму ў вёсцы, людзі прыходзілі і ўсё мне расказвалі. Праўда, мае дзеці, якія сядзяць у інтэрнэце, не ведаюць ужо гэтых расказаў. Сёння я падумаў, што трэба сесці вечарам і ім парасказваць пра сям'ю.

Падляшскія хронікі натхняюць задумацца пра свой лёс. І пра адказнасць перад ім. У час папярэдняга перапісу насельніцтва айцец Яўгеній Сушч гаварыў людзям каб запісвалі сябе беларусамі. Мы спыталі ці зараз будзе працягваць справу:

— *А чы я маю іннэ выйсце?* — здзіўляецца бацюшка. — *Нэ маю выйсця!* Трэба да людзей гаварыць, вучыць іх і самому вучыцца. Трэба, каб яны запісваліся тым, кім ёсць на самай справе. І каб гаварылі пра гэта не шэпатам, толькі адкрытым голасам, на нармальнай мове.

ISSN 0546-1960